Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 ЖНІЎНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 154 (29268)

Выбары ў Беларусі адбыліся. Паводле папярэдніх падлікаў, у выбарах Прэзідэнта паўдзельнічалі 5 818 965 выбаршчыкаў, ці 84,27 працэнта. За Андрэя Дзмітрыева прагаласавалі 70 613 чалавек (1,21 працэнта), Ганну Канапацкую — 97 552 (1,68 працэнта), Аляксандра Лукашэнку — 4 659 561 (80,08 працэнта), Святлану Ціханоўскую — 587 411 (10,09 працэнта), Сяргея Чэрачня — 66 695 (1,15 працэнта). Супраць усіх прагаласавала 4,6 працэнта выбаршчыкаў.

АЛЯКСАНДР РЫГОРАВІЧ ЛУКАШЭНКА — ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

«Папярэднія даныя, вядома, па меры падрыхтоўкі пасяджэння Цэнтральнай камісіі, прысвечанага выніку выбараў, будуць удакладняцца. Але я не думаю, што яны істотным чынам зменяцца. Гэтыя даныя карэліруюцца з данымі на ўчастках закрытага галасавання, дзе большую частку складаюць якраз неваенныя (з 36 тысяч закрытых участкаў гэта толькі 6 тысяч — усё астатняе гэта грамадзянскія асобы, якія знаходзяцца ў бальніцах і санаторыях-прафілакторыях і прадстаўляюць усе слаі грамадства), то-бок яны абсалютна неангажыраваныя», — звярнула ўвагу старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.

СТАР. 2–7

Фота БелТА.

КРАІНА ЗРАБІЛА СВОЙ ВЫБАР



ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы краіну на шчыты не складваем»

Прэзідэнт у размове з выканаўчым сакратаром Садружнасці Незалежных Дзяржаў Сяргеем Лебедзевым абмеркаваў падзеі, якія адбываліся ў Беларусі ў ноч пасля выбараў.

«Ноччу хадзілі, бадзяліся, спрабавалі хлопцаў з міліцыі атакаваць і ў асобных момантах атакавалі. Але хлопцы годна выстаялі і адказалі. Ёсць у нас людзі пацярпелыя. Канешне, гэта нязначныя (раненні. — **«Зв.»**) — стральбы не было. Але тым не менш і тым, і тым дасталося — і з боку міліцыі, і з боку грамадзянскага насельніцтва. Каля 40—50 чалавек грамадзянскага насельніцтва і каля 30 міліцыянераў пацярпелі», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Ён назваў фэйкамі паведамленні, што ў нейкім горадзе АМАПаўцы склалі шчыты. «Пачынаю ўдакладняць — абсалютная хлусня. Звычайныя, простыя хлопцы кажуць: «Мы краіну на шчыты не складваем. Мы будзем абараняць, наколькі гэта магчыма», — канстатаваў Прэзідэнт.

Па яго інфармацыі абараняць прыйшлося спакой не толькі мінчан, але і іншых кандыдатаў. Па словах кіраўніка краіны, аб'яднаныя штабы і апазіцыйныя журналісты, усяго каля 60 чалавек, былі сабраны ў адным офісе.

«Мы атрымалі інфармацыю ад іх жа, хтосьці там з галавой сябруе. Яны ўбачылі, што вакол гэтага офіса натоўп сабраўся, вострая сітуацыя. І ад іх хтосьці папрасіў, каб улада іх абараніла. Я даручыў КДБ імгненна самых моцных вайскоўцаў накіраваць негалосна, узяць пад кантроль гэты офіс, каб не дай бог, не забілі кагонебудзь. Была патрэбна сакральная ахвяра, — працягнуў Аляксандр Лукашэнка. — Мы іх абаранялі ўсю ноч, і зараз кантралюем сітуацыю, каб, не дай бог, хтосьці камусьці не адарваў галаву».

Інфармацыю пра забойства польскага грамадзяніна Прэзідэнт таксама назваў выдумкай.

«Ім патрэбна ахвяра. Вы бачыце, што там школьнікі ёсць, 16, 17, 18 гадоў, рознія, — куды глядзяць бацькі? Іх жа проста кідаюць на штыкі лялькаводы, а самі хаваюцца за спіны», — дадаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што затрымалі па краіне каля 3000 арганізатараў беспарадкаў, амаль палову з іх у Мінску. «Яны хаваюцца і штурхаюць гэтых. Абкураных, п'яных шмат, з наркотыкамі — жах. Мы кантралюем, каб, не дай бог, не дапусціць гэтага пажару», — дадаў лідар.

Кіраўнік краіны паведаміў, што самае небяспечнае, што ў дзень выбараў 33 участкі ў Мінску блакіравалі натоўпы, і яму прыйшлося прыцягнуць ваенных, каб эвакуіраваць камісіі. У тым ліку і з Дома ўрада Цэнтральную выбарчую камісію і яе кіраўніка Лідзію Ярмошыну.

«Я ўсіх папярэдзіў, і ўлада з гэтым справілася. Ды і тое вельмі мякка адносіліся. Не па законе, вельмі мякка падыходзілі. Яны нейкае УУС ці РУУС хацелі штурмам узяць і публічна сарвалі шлем з хлопца-АМАПаўца... Добра, што паспелі хлопцы з АМАПа і нават, па-мойму, гумавыя кулі прымянілі ў гэты момант, разагналі натоўп. Сітуацыя была ноччу напружаная, але малайцы, міліцыя справілася. Армію і службу бяспекі мы прыцягнулі толькі, каб эвакуіраваць выбарчыя камісіі», — расказаў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка назваў выбары святам, «якое камусьці захацелася сапсаваць».

«Мы іх убачылі, яшчэ ярчэй яны засвяціліся гэтай ноччу. Мы адфіксавалі ўсе званкі з-за мяжы — з Польшчы, з Вялікабрытаніі, і з Чэхіі былі апошнія званкі, кіруючы нашымі, прабачце мяне, авечкамі. Яны не разумеюць, што робяць. Адна ж з'ехала кудысьці, ці ў Польшчу, ці то ў Расію. Дзве засталіся. Яны ж не разумеюць, што робяць. Імі пачынаюць ужо кіраваць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ва ўездзе ў Беларусь адмоўлена амаль 180 чалавекам, якія мелі фальшывыя дакументы ці не ведалі, навошта едуць.

Па словах Прэзідэнта, з-за мяжы адключаюць інтэрнэт, каб выклікаць незадаволенасць насельніцтва. Спецыялісты разбіраюцца, адкуль ідзе блакіроўка. «Калі інтэрнэт дрэнна працуе, гэта не наша ініцыятыва, а з-за мяжы. То-бок дзейнічаюць мэтанакіравана, гібрыдна па ўсіх кірунках. Але мы вытрымаем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

• Каментарый у тэму

Прэзідэнт Беларусі імкнецца кансалідаваць беларускі народ

Пра гэта па выніках размовы з кіраўніком краіны расказаў журналістам Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ.

«Ён сказаў, што ёсць людзі, якія прытрымліваюцца іншай пазіцыі, меркавання. Яны сваё меркаванне выказалі, прагаласавалі за альтэрнатыўных кандыдатаў. Але ён Прэзідэнт усёй Беларусі і ўсяго беларускага народа і, канешне, будзе ўлічваць настроі людзей. Самае галоўнае — у інтарэсах міру, стабільнасці і далейшага руху Беларусі наперад і ў эканамічнай, і ў культурнай сферы», — акцэнтаваў увагу прадстаўнік СНД.

Як заўважыў Сяргей Лебедзеў, галасы былі аддадзены і за альтэрнатыўных кандыдатаў, якія ў сваіх выступленнях казалі пра недапушчальнасць майданаў і кровапраліцця.

«Прэзідэнт мне сказаў, што ў спецслужбаў ёсць важкія падставы для таго, каб убачыць за ўсімі падзеямі, якія адбыліся ўчора ў Мінску, руку правакатараў, — дадаў ён. — Перамовы, якія вялі арганізатары акцый і іншыя факты сведчаць пра тое, што было жаданне дэстабілізаваць абстаноўку, але дзякуй богу (гэта таксама меркаванне Прэзідэнта) удалося не дапусціць нейкіх катастрафічных падзей і наступстваў гэтых выступленняў».

Сяргей Лебедзеў падзяляе спадзяванне Прэзідэнта Беларусі, што пасля выбараў меншасць згодзіцца з меркаваннем большасці беларусаў.

«Гэта больш, чым космас»

Так Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сказаў пра тэхналогіі, якія з'явяцца праз тры-чатыры гады на адлегласці 43 кіламетры ад Мінска, у Пухавіцкім раёне. Тут, каля вёскі Уборы ўжо ўведзеныя ў эксплуатацыю першыя аб'екты Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі.

Фота БелТА.

Трэба сказаць, што сельскай гаспадарцы кіраўнік дзяржавы прысвяціў прэздадзень асноўнага дня галасавання на прэзідэнцкіх выбарах і раніцу наступнага. Гэта засведчыла прытрымліванне яго слоў пра тое, што «пандэмія пандэміяй, выбары выбарамі, а есці хочацца заўсёды».

Задача на сёлета — 10,5 мільёна тон збожжа

Уборачная кампанія — на асабістым кантролі кіраўніка дзяржавы. У суботу Аляксандр Лукашэнка наведаў ААТ «Гастэлаўскае» Мінскага раёна, дзе азнаёміўся са станам спраў у аграрным сектары непасрэдна на палетку азімай пшаніцы. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван Крупко далажыў аб актыўнай рабоце па ўборцы збожжавых каласавых культур у краіне. На стане на раніцу суботы ў Беларусі быў убраны 61 працэнт плошчаў (кожны дзень дадаецца каля пяці працэнтаў), атрымана амаль шэсць мільёнаў тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 38,2 ц/га (на 6,1 працэнта больш, чым летась).

На полі хлеб гэты ёсць, яго трэба проста ўзяць, заўважыў Прэзідэнт. «Калі мы выйдзем на дзесяць з паловай (мільёнаў тон. — **«Зв.»**) — гэта больш за тону на чалавека ў нас атрымаецца — больш у будучыні не трэба. Дзесяць з паловай на гэтым этапе дастаткова для краіны, каб накарміць скаціну і часткова забяспечыць БНБК», — абазначыў задачу кіраўнік дзяржавы. Ніжэй за гэты ўзровень апускацца нельга ні пры якіх умовах надвор'я, дадаў ён.

Па падліках Аляксандра Лукашэнкі, новая тэхналагічная вытворчасць, якой стане Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя, мае патрэбу ад 800 тысяч да мільёна тон збожжа. Яго можна закупіць за мяжой, але пажадана, адзначыў кіраўнік дзяржавы, каб беларусы самі яго вырасцілі.

Новая сельская гаспадарка

Раніцай пасля выбараў Аляксандр Лукашэнка наведаў пляцоўку той самай Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі, пра якую казаў на полі «Гастэлаўскага». Тут ужо гатовы прымаць беларускае збожжа, да канца жніўня ўвядуць у эксплуатацыю збожжасховішча, аўтапрадпрыемства, вадавод, кацельню, чыгунку, газаправод і лінію электрапередачы, у верасні запрацуюць заводы па вытворчасці прэміксаў (магутнасцю 150 тысяч тон), камбікармоў для рыб (110 тысяч тон), свіней (316 тысяч тон), буйной рагатай жывёлы і птушкі (450 тысяч тон). Агулам — больш за адзін мільён тон гатовай прадукцыі ў год. Адначасова тут можна захоўваць 450 тысяч тон сіласу, дасушваць 400 тон збожжа ў гадзіну.

Інвестыцыйная пляцоўка плошчай 160 гектараў падзеленая на дзве зоны — агратэхнічную і біятэхналагічную. Кантракты на продаж прадукцыі першай зоны ўжо падпісаныя. Рэнтабельнасць складзе 15—20 працэнтаў, але ў будучым можа вырасці.

Другая зона прадугледжвае вытворчасць вітамінаў. Яна ўключае мукамольны завод, вытворчасць крухмалу, глютэну, камбікормавай дабаўкі, глюкозы і прадукцыі біятэхналогій — лізіну (80 тысяч тон), трэаніну (8 тысяч тон) і трыптафану (1600 тон).

Чакаецца, што комплекс будзе вырабляць за год таварнай прадукцыі на суму 650 мільёнаў долараў, выпрацоўка на аднаго чалавека складзе 375 тысяч долараў (больш толькі ў нафтаперапрацоўчых заводаў).

Сваім гонарам кіраўніцтва карпарацыі называе навукова-даследчы цэнтр, у якім працуюць вучоныя некалькіх інстытутаў.

Пасля знаёмства з праектам перспектыўнага развіцця і планамі карпарацыі на найбліжэйшы час Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў свае ўражанні журналістам. Размову з імі распачаў фразай: «Адна справа — перамагчы, гэта важна, іншая справа — абараніць гэтую перамогу. Вось чым мы зараз і займаемся».

Калісьці Аляксандр Лукашэнка параўнаў тэхналогіі БНБК з касмічнымі, цяпер, адказваючы на пытанне, ці ўражаны ўбачаным, ён сказаў: «Космас будзе праз тры-чатыры гады, да 2024-га, калі мы будзем казаць не толькі пра перспектыву камбікармоў, не толькі пра дабаўкі і падобнае, але калі пачнём казаць пра лекі, вітаміны, гэта ўжо — космас. І гэты космас не далёкі, ужо распачатае праектаванне, трэцяя чарга ў наступныя тры гады будзе пабудаваная».

Прэзідэнт заўважыў, што пандэмія каранавіруса спыніла эканоміку ва ўсім свеце, у выніку атрымалася так, што кітайская інжынірынгавая кампанія з сусветным імя CITIC, якая з'яўляецца генеральным падрадчыкам праекта, на гэты час працуе толькі ў Беларусі.

«Наша шчасце, што мы абралі правільную тактыку і не закрылі краіну, — пракаментаваў сітуацыю кіраўнік дзяржавы. — Праз тры гады мы з вамі сюды прыедзем, дакладна прыедзем, і ўбачым тут касмічную вытворчасць. Такой вытворчасцю валодаюць адзінкі краін — чатыры ўсяго. І сярод іх Беларусь. Гэта больш, чым космас. Космасам мы з савецкіх часоў займаемся, а гэта цалкам новая вытворчасць».

Вельмі важна, што яна будзе працаваць на айчыннай сыравіне. 700 тысяч тон збожжа, па словах Прэзідэнта, сёння гатова купляць БНБК па сусветных цэнах, якія вышэйшыя, чым гранічныя максімальныя, якія рэкамендаваныя Мінсельгасхарчам Беларусі. Кіраўніцтва карпарацыі зацікаўленае ў вытворчасці збожжа ў раёне і гатова ў гэта інвеставаць грошы.

«Словам, гэта наймацнейшы лакаматыў аграпрамысловай вытворчасці і не толькі аграпрамысловай. Ну і не трэба забываць, што яны тут цэлы інстытут стварылі, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Яны будуць тут біятэхналогіі распрацоўваць, штамы свае і іншае, і рухаць вытворчасць».

Беларускі лідар падкрэсліў, што з'яўленнем «касмічных» тэхналогій у АПК краіна абавязана КНР і асабіста яе кіраўніку.

«Гэта падарунак кітайскага народа і асабіста гэтага чалавека, які толькі што мяне першы павіншаваў з нашай з вамі перамогай», — сказаў ён.

Варвара МАРОЗАВА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЗЫХОДЗІЦЬ БУДЗЕМ З ІНТАРЭСАЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА»

Традыцыйна пасля галасавання на выбарчым участку № 1 Цэнтральнага раёна сталіцы кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанні журналістаў. Магчымасць задаць пытанне — любое — была ў кожнага з амаль дзевяці дзясяткаў прадстаўнікоў беларускіх і замежных СМІ.

Фота БелТА.

«Усё будзе нармальна»

Сітуацыя ў краіне пад кантролем, і беларусы на гэты конт могуць быць спакойныя, запэўніў Прэзідэнт. Ён паведаміў, што 170 чалавекам за ноч перад асноўным днём галасавання і раніцу гэтага дня было адмоўлена ў перасячэнні граніцы. Прычына — альбо фальшывыя візы, альбо адсутнасць выразнага тлумачэння мэты прыезду ў нашу краіну.

«Мы не расслабляемся, усе нашы адпаведныя структуры і спецслужбы пераведзеныя на ўзмоцнены рэжым нясення службы — не толькі міліцыя і не толькі пагранічнікі», — рассказаў ён.

Каментуючы асаблівасці сёлетняй выбарчай кампаніі, Аляксандр Лукашэнка назваў яе самай складанай.

«Складанасць у тым, што мы, магчыма, шмат чаго не ведаем. Таму вымушаны працаваць па ўсіх франтах».

Ён дадаў, што дзяржаўны апарат прадугледжвае ўсякія варыянты, але падстаў казаць пра тое, што заўтра краіна будзе ўвагнаная ў хаос, абсалютна няма. На думку кіраўніка дзяржавы, галоўная рухаючая сіла спроб расхістаць сітуацыю ў краіне — грошы: «Я доўга думаў — ну што ж адбываецца. Вывад просты, як вы кажаце: «бабло». Грошы. Заплаціў — няважна, які пашпарт, якія ідэі, грошы ёсць —ваюем, змагаемся. Так і ў нас у краіне знутры адбываецца... Мы нічога тут не выключаем, але працуюць грошы. Таму, я думаю, заўтра ўжо яны адпрацуюць свае грошы, інвестыцыі гэтыя асвояць, супакояцца і зразумеюць, што жыццё ж адно». Тыя, хто сёння супрацьстаіць уладзе, застануцца жыць тут разам са сваімі апанентамі, заўважыў Прэзідэнт.

«Мы ўсе на гэтым кавалку скандэнсаваны... мы ў адной лодцы. Будзем разгойдваць гэтую лодку, усе патонем разам. Таму ўсё будзе нармальна. Ідзе працэс. Працэс няпросты, але мы гатовыя да ўсяго», — запэўніў беларускі лідар.

«Я гатовы весці дыялог»

«Калі вы проста выказваеце сваю пазіцыю або пазіцыю некага і там відаць, што гэта Пятроў, Сідараў, Іваноў, я гэта вітаю. Я гатовы з вамі весці дыялог, асабіста гатовы з вамі весці дыялог. Калі вы тэндэнцыйна пачынаеце паводзіць сябе, скажам так, я таксама гэта бачу — адпаведнае стаўленне. А калі вы правакуеце, ну дык атрымаеце тое самае ў адказ. Што не так? Вы што, хочаце спрабаваць звергнуць уладу, зламаць нешта, укалоць, абразіць, як гэта вы рабілі спачатку больш, зараз менш, і чакаеце, што перад вамі я або нехта ўкленчыць і будзе вам цалаваць калені? Цалаваць пясок, па якім вы хадзілі? Не будзе гэтага!» — адрасаваў ён пасыл недзяржаўным СМІ.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў да законнасці і выказаў упэўненасць, што шэраг медыярэсурсаў хацелі абвастрэння сітуацыі на вуліцах краіны.

«Пакуль мардабою не было, проста мы вас паставілі на месца, — заўважыў лідар. — Што вы хочаце ад нас? Хочаце, каб я ўкінуў у хаос краіну? Дык вы ж мяне потым стопчаце і будзеце мець рацыю, што я не абараніў, у тым ліку і вас, і вашу сям'ю. Я хачу, каб было спакойна, каб мы з вамі вялі дыялог, калі ён ёсць. І калі вы здольныя нешта зрабіць для краіны, наверце, я вам ствару ўсе ўмовы, каб вы працавалі на краіну».

«Выконвайце закон»

Кіраўнік краіны адзначыў, што ў яго чатыры канкурэнты і Святлану Ціханоўскую ён не лічыць галоўным з іх, ніякіх рэпрэсій і парушэнняў закону да яе каманды не распачынаў і распачынаць не будзе.

«Выконвайце закон, і знікнуць усялякія размовы пра рэпрэсіі і яшчэ нешта. Будзеце парушаць — будзеце адказваць. І тое мы яшчэ мякка адказвалі, і шчыра я вам яшчэ скажу — я заўсёды стрымліваў праваахоўнікаў. Паўтарыць, што я ім сказаў? «Яны нічога не вартыя, каб супраць іх распачынаць нейкія рэпрэсіі. Нічога не вартыя з пункту гледжання палітыкі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Яго абурае праграма, якую прапанавалі канкурэнты, — адпусціць затрыманых і потым правесці выбары зноў.

«Вы Канстытуцыю чыталі? Я ўжо ў Пасланні гэтае пытанне закрануў. Ні я, ні кандыдат, які пераможа, калі не я, не назначае ў Беларусі прэзідэнцкія выбары. Парламент вам не дасць магчымасці ўвагнаць краіну ў перманентныя выбары. Вы разумееце, што вы прапаноўваеце народу?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

На пытанне пра міжнародную ацэнку выбараў і пра імавернасць загадзя падрыхтаваных у заходніх партнёраў шаблонаў рэакцый Прэзідэнт адказаў коратка: «Калі шчыра, усё, што падрыхтавана, я ўжо прачытаў».

«Не чакайце, што перад намі расшаркаюцца і скажуць: малайцы, беларусы. Палітыка — гэта барацьба, а для нас — мастацтва магчымага. Мы не хочам, каб пра нас казалі блага, але выходзіць будзем з інтарэсаў беларускага народа. Я хачу, каб у маёй краіне, у вашай, было ціха і спакойна, каб мы маглі гадаваць нармальна сваіх дзяцей, не азіраючыся па баках», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Дом з вокнамі на ўсход і на захад»

На пытанне польскага журналіста: «Куды паедзеце з візітам у выпадку перамогі на выбарах?» Аляксандр Лукашэнка адказаў: «Туды, куды запросяць. Я пакуль, шчыра вам скажу, асабліва не напружваюся з нагоды сваіх першых візітаў. Я ж не першы год буду Прэзідэнтам, калі мне людзі даверацъ. Таму ў мяне няма гэтай праблемы. Я ўжо з «першымі візітамі» наездзіўся. Таму шчыра вам скажу: гэтай праблемы ў мяне няма. Мы не будзем здзяйсняць візіт дзеля таго, каб нешта прадэманстраваць. Нам гэтага не трэба».

Курс знешняй палітыкі абазначаны ў Пасланні народу і парламенту, дадаў Прэзідэнт.

«Беларусь — гэта дом у цэнтры Еўропы з вокнамі на ўсход і на захад, з выхадам на поўдзень і на поўнач, — падкрэсліў ён. — Гасподзь так вызначыў, у сілу нашага месцазнаходжання мы вымушаныя, знаходзячыся ў геаграфічным цэнтры Еўропы, супрацоўнічаць з усімі. Мы будзем супрацоўнічаць. Я ўжо сказаў, што на ўсходзе ў нас вельмі моцныя дзве дзяржавы: хочам мы, не хочам, але з Расіяй заўсёды будзем супрацоўнічаць, заўсёды будзем разам у залежнасці ад таго, наколькі Расія здольная на больш цеснае альбо менш цеснае супрацоўніцтва. Бліскучыя адносіны з Кітайскай Народнай Рэспублікай, яны развіваюцца; з постсавецкімі краінамі, рэспублікамі ў нас вельмі добрыя адносіны. І з Польшчай у нас наладжваюцца адносіны. І калі вы там не будзеце праводзіць антыбеларускія акцыі, тыпу дэманстратыўнага давання прытулку розным дзеячам — ведаеце, пра што я кажу, — тады мы будзем выбудоўваць з вамі адносіны». Аляксандр Лукашэнка дадаў, што нафту і газ Беларусь будзе купляць там, дзе больш выгадна, пры гэтым яна працягне пазбаўляцца залежнасці ад адной краіны, таму працягне супрацоўнічаць, у тым ліку, і з Польшчай.

Што датычыцца затрыманых баевікоў, то беларускі бок запрасіў генеральных пракуроraў Украіны і Расіі, каб разам абмеркаваць гэту сітуацыю, але пакуль ні адзін, ні другі не прыехалі.

«Не прыедуць — мы самі разбяромся і вырашым гэту праблему, — паведаміў Прэзідэнт. — Але запрашэнне пракуроraў і адмова сюды прыехаць сведчаць пра тое, што наплявацъ ім на лёс гэтых хлопцаў... Мне ўсё роўна на цяперашні момант, хто іх сюды накіроўваў, гэта другаснае. Галоўнае, каб яны не ўчынілі тут пажар у цэнтры Мінска. Вось што для мяне сёння важна. Вядома, мы гэта будзем улічваць і будаваць свае адносіны (з іншымі краінамі. — **«Зв.»**) зыходзячы, у тым ліку, з гэтых момантаў».

Разам з тым пра перспектыву двухбаковых адносін Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Калі хтосьці чакае, што ў нас абсалютна сапсаваліся адносіны з Расіяй, памыляецеся. Мы з Прэзідэнтам Расіі прынялі рашэнне, і ніякія сродкі масавай інфармацыі, «вагнеры» і іншыя на гэта паўплываць не ў стане. Гэта квінтэсэнцыя, сутнасць нашых размоў з Прэзідэнтам Расіі».

«Ёсць тэндэнцыі да таго, што мы выкараскаемся»

Асобна Аляксандр Лукашэнка спыніўся на наступствах пандэміі каранавіруса для беларускай эканомікі. У Беларусі намецілася хай невялікая, але дынаміка прыросту. Залатавалютныя рэзервы за гэты перыяд павялічыліся амаль да дзевяці мільярдаў.

«Гэта нечаканасць, у тым ліку і для мяне. Ёсць добрыя тэндэнцыі да таго, што мы выкараскаемся з гэтага крызісу», — сказаў ён.

Пацікавіліся журналісты і станам здароўя кіраўніка дзяржавы, які сам перахварэў на каранавірус. Як расказаў Аляксандр Лукашэнка, ён адчуваў сябе стомленым, але спісваў гэта на вялікія нагрузкі.

«Калі дамашнія мае прасігналізавалі, што ёсць праблемы, мы паехалі ў бальніцу і ўпэўніліся, што я перанёс той вірус на нагах, але хвастом усё ж такі мяне гэтая пандэмія ўдарыла. Калі б я не паехаў правярацца, можа, так і перанёс бы», — падзяліўся Прэзідэнт.

«А людзям сталейшым усё ж такі трэба берагчы сябе, таму што хвароба вылечная (нашы ўрачы малайцы, навучыліся) — але такая агідная, што далей няма куды... Хвароба вылечная, але вывады трэба зрабіць. Трэба прытрымлівацца здаровага ладу жыцця, правільнага харчавання. І ні ў якім разе не сядзець дома, быць больш на свежым паветры, варушыцца, бегаць, скакаць, займацца спортам», — параіў кіраўнік дзяржавы.

Дзень выбараў і ўраджай

Прэзідэнт павіншаваў «Звязду» са 103-годдзем — 9 жніўня 1917 года выйшаў першы нумар нашай газеты. Наша карэспандэнт, задаючы пытанне кіраўніку краіны, нагадала пра гэта. «Я вас віншую. Дзякуй вялікі за інфармацыю», — сказаў ён, і ўсе прысутныя паапладзіравалі ў гонар нашага свята.

Першае пытанне «Звязды» да Прэзідэнта гучала так: «Як пройдзе ваш дзень у чаканні вынікаў галасавання?» Па яго словах, звычайна.

«Я нічога на цяперашні момант змяніць не магу, як вы разумееце. Усё залежыць ад людзей, якія прыйдуць на ўчастак. Я ж не першыя выбары перажываю. Таму ў мяне ёсць пэўны вопыт. Я буду чакаць вынікі як і ўсе вы — проста чакаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на другое пытанне нашага выдання, Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што беларусы годна збяруць сёлетні ўраджай. Па яго словах, убраць рэшту збожжавых за тры наступныя дні — не праблема. Дажджы, які пройдуць днямі на тэрыторыі Беларусі, ён назваў шчасцем, бо яны неабходныя культурам, якія застаюцца на палях.

«І кукуруза, і бульба, і капуста, і многае іншае на поле расце, і неабходны дождж. Гэта не страшна, людзі адпачнуць, пачысцяць камбайны і заўтра ці ўвечары выйдуць збіраць тыя ж збожжавыя. У мяне добры настрой», — паведаміў Прэзідэнт.

Ён заўважыў, што Гасподзь пашкадаваў нас, даўшы добры ўраджай.

Такая розная моладзь

Прадстаўнікі маладзёжнага актыву, якія стаялі побач з журналістамі, выказалі словы падтрымкі Прэзідэнту. Кіраўнік дзяржавы папрасіў прадстаўнікоў недзяржаўных СМІ, якія задавалі правакацыйныя пытанні, звярнуць увагу на гэтае выказванне.

«Вы гэта чачулі? Ну, вы можаце сказаць, што яны там «прыкарытнікі», ды яны там побач з кармушкамі і гэтак далей. Але гэта самастойныя людзі, якія адбыліся, і што самае галоўнае — гэта таксама моладзь. Моладзь, як я казаў, таксама розная», — звярнуўся да прысутных Аляксандр Лукашэнка.

Задавалі апошнія пытанні журналісты пад моцным дажджом, але рашэнне працягнуць размову ў такіх умовах яны прынялі самі.

Журналіст амерыканскага інфармацыйнага агенцтва спытаў Прэзідэнта, ці ўпэўнены ён у сваёй перамозе і ці плануе і далей балатавацца на пасаду кіраўніка краіны.

«Калі буду жывы і здаровы, адкажу, ці збіраюся я балатавацца ў далейшым. А што датычыцца ўпэўненасці ў сваёй перамозе — я б не быў так адназначны. Я спадзяюся», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА,
Варвара МАРОЗАВА,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Камісіі працавалі ў беспрэцэдэнтных умовах

На пытанне аб чэргах, якія ўзніклі ўвечары 9 жніўня на некаторых выбарчых участках, старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА выказала ўпэўненасць, што чэргі ніяк не могуць паўплываць на з'яўленне ці адсутнасць сумненняў у адкрытасці і дэмакратычнасці выбараў.

«Увогуле, па законе, участкі трэба было закрыць у восем гадзін вечара, але сыходзячы з таго натоўпу, які проста мог іх разграміць (што казаць, там шмат было агрэсіўных — гэта ўсё былі прыхільнікі альтэрнатыўных кандыдатаў, тыя, каго мы называем «электарат пратэсту»), уладамі Мінска, дарэчы, а абсалютна не Цэнтральнай камісіяй, было прынята рашэнне працягнуць (работу ўчасткаў. — **«Зв.»**), пакуль не прагаласуе кожны, хто стаіць у гэтай чарзе», — растлумачыла кіраўнік камісіі.

Пры жаданні працяг работы ўчасткаў можна расцаніць як парушэнне закона і адшукаць у сітуацыі падставу для падачы скаргі аб прызнанні выбараў несапраўднымі, прынамсі, на гэтых участках, пагадзілася спікер.

«Але тым не менш, яны ўсё ж такі на вынікі волевыяўлення не ўплываюць», — дадала кіраўнік ЦВК.

На яе думку, беспрэцэдэнтныя ўмовы, у якіх сёлета давялося працаваць выбарчым камісіям, падштурхоўваюць грамадства да пераходу ў будучым на электроннае галасаванне, каб пазбегнуць ціску.

Варвара МАРОЗАВА.

Міру і росквіту

Замежныя лідары віншуюць Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах

Першым накіраваў пасланне старшыня КНР Сі Цзіньпін, выказаўшы ўпэўненасць, што пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі Беларусь абавязкова дасягне новых бліскучых поспехаў у справе дзяржаўнага будаўніцтва. Кітайскі лідар адзначыў, што ў апошнія гады беларуска-кітайскія адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства функцыянуюць на высокім узроўні.

«Кітай і Беларусь з'яўляюцца «жалезнымі братамі» і ўсебаковымі партнёрамі. Я надаю вялікае значэнне развіццю кітайска-беларускіх адносін і даражу добрымі рабочымі адносінамі і асабістым сяброўствам з вамі», — падкрэсліў Сі Цзіньпін.

Старшыня КНР выказаў гатоўнасць разам з кіраўніком беларускай дзяржавы прыкладаць намаганні для сумеснага прасоўвання кітайска-беларускіх адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства, адкрыцця новых перспектыў узаемавыгаднага супрацоўніцтва ў розных галінах на карысць дзвюх краін і народаў.

Сі Цзіньпін пажадаў Аляксандру Лукашэнку моцнага здароўя і поспехаў у працы, сяброўскай Беларусі — росквіту і магутнасці, а яе народу — шчасця і дабрабыту.

Віншавальную тэлеграму накіраваў Аляксандру Лукашэнку і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін.

«Разлічваю, што ваша дзяржаўная дзейнасць будзе садзейнічаць далейшаму развіццю ўзаемавыгадных расійска-беларускіх адносін ва ўсіх абласцях, паглыбленню супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, нарошчванню інтэграцыйных працэсаў па лініі Еўразійскага эканамічнага саюза і СНД, а таксама ваенна-палітычных сувязяў у Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Гэта, несумненна, адпавядае карэнным інтарэсам братэрскіх народаў Расіі і Беларусі», — гаворыцца ў віншаванні кіраўніка Расіі.

З нагоды перавыбрання на пасаду Прэзідэнта Аляксандру Лукашэнку тэлеграму накіраваў Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў, адзначыўшы: «Вынікі выбараў, якія адбыліся ў складанай палітычнай сітуацыі, сведчаць аб народнай падтрымцы вашага стратэгічнага курсу, накіраванага на ўмацаванне суверэнітэту і незалежнасці Беларусі».

Касым-Жамарт Такаеў выказаў упэўненасць, што ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж Казахстанам і Беларуссю будзе і надалей паспяхова развівацца на карысць народаў дзвюх дзяржаў. Казахстанскі лідар пажадаў Прэзідэнту Беларусі поўнай рэалізацыі ўсіх намечаных планаў на пасадзе кіраўніка дзяржавы, а беларускаму народу — міру, стабільнасці, узаемаразумення і працвітання.

Па ініцыятыве азербайджанскага боку адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева, які выказаў самыя шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні ў сувязі з пераканаўчай перамогай Аляксандра Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах. Ільхам Аліеў падкрэсліў, што ў Азербайджане асабліва цэняць сяброўскія адносіны з кіраўніцтвам брацкай Беларусі.

У тэлефоннай размове павіншаваў беларускага Прэзідэнта і таджыкскі калега Эмамалі Рахмон. Прэзідэнт Таджыкістана адзначыў, што ён сам з самага ранку прымае шматлікія віншаванні з перамогай беларускага сябра на выбарах, а Беларусь і яе кіраўніка ад усёй душы віншуе таджыкскі народ. Эмамалі Рахмон перадаў Аляксандру Лукашэнку самыя цёплыя пажаданні і шчырыя словы падтрымкі.

Павіншаваў Аляксандра Лукашэнку Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў, падкрэсліўшы: «Высокая яўка выбаршчыкаў і вынікі галасавання яшчэ раз прадэманстравалі велізарны давер беларускага народа да вас, яго з'яднанасць і поўную падтрымку працягу эфектыўных рэформаў, якія праводзяцца пад вашым кіраўніцтвам і накіраваны на павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва, забеспячэнне ўстойлівага эканамічнага росту ў краіне».

Віншаванні паступілі таксама ад Прэзідэнта Кыргызстана Сааранбая Жээнбекава, ад прэм'ер-міністра Арменіі Нікола Пашыняна і ад прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана.

Паводле БелТА.

Фота БелТА.

Выбары: меркаванні назіральнікаў

ЗАЎВАГІ НЕІСТОТНЫЯ

Місія назіральнікаў ад СНД станоўча ацаніла арганізацыю выбарчага працэсу ў Беларусі

На думку назіральнікаў ад СНД, зафіксаваныя асобныя парушэнні на выбарах Прэзідэнта Беларусі не мелі сістэмнага масавага характару і не паўплывалі на вынікі выбараў, місія не адшукала фактаў, якія ставяць пад сумненне легітымнасць выбараў, сказаў кіраўнік Місіі, старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ на прэс-канферэнцыі.

«Выбары 9 жніўня 2020 года праведзены ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Беларусі. Яны былі адкрытыя, канкурэнтныя і забяспечылі свабоднае волевыяўленне грамадзян», — агучыў вывады місіі яе кіраўнік.

Сяргей Лебедзеў нагадаў, што місія назіральнікаў ад СНД працавала ў Беларусі з 24 ліпеня. У склад місіі ўвайшлі 184 прадстаўнікі васьмі дзяржаў Садружнасці. На прэс-канферэнцыі назіральнікі адзначылі добрую арганізацыю выбараў, годнае афармленне выбарчых участкаў і падрыхтоўку членаў выбарчых камісій усіх узроўняў.

«Радуе, што ўсе кандыдаты ў Прэзідэнты выступалі за мірнае правядзенне выбарчай кампаніі, недапушчэнне дзеянняў, якія ідуць супраць заканадаўства Беларусі, «майданаў» і гэтак далей. Настрой саміх кандыдатаў, які яны выказвалі публічна, быў мірны, канструктыўны, нягледзячы на прыкметныя адрозненні ў іх праграмах, дакументах», — падкрэсліў кіраўнік місіі.

Місія дала агульную станоўчую ацэнку арганізацыі выбарчага працэсу, канстатаваўшы яго большы палітычны накал у адрозненне ад папярэдніх кампаній. Разам з тым, у праекце заявы зафіксавана, што агітацыя суправаджалася некарэктнымі, правакацыйнымі публікацыямі, якія садзейнічалі росту напружанасці ў грамадстве.

Назіральнікі ад СНД лічаць датэрміновае галасаванне зручнай для выбаршчыкаў формай правядзення выбараў, таму крытыку наконт яго назвалі беспадстаўнай. З нагоды іншых папрокаў Сяргей Лебедзеў адзначыў, што фотаздымка бюлетэняў не забаронена. Таксама кіраўнік місіі адзначыў, што гэту выбарчую кампанію істотна ўскладніла пандэмія каранавіруса, таму да абмежавальных мер назіральнікі ставіліся з разуменнем.

«Мы прыехалі сюды як сябры Беларусі. Мы вашы партнёры і па Садружнасці Незалежных Дзяржаў, і па іншых інтэграцыйных структурах. Мы разам вырашаем праблемы, якія ўзнікаюць перад нашымі краінамі, стараемся палепшыць жыццё нашых грамадзян», — рэзюмаваў Сяргей Лебедзеў.

Генеральны сакратар Савета МПА СНД — кіраўнік Сакратарыята Савета МПА СНД Дзмітрый КАБІЦКІ дадаў, што з участкаў, створаных за межамі Беларусі ў Баку, Ерэване, Кішынёве, Санкт-Пецярбургу і Маскве, дзе было арганізавана назіранне, не атрымана ніводнай скаргі ці сур'ёзных заўваг.

Варвара МАРОЗАВА.

«ПАСТАЎЛЕНАЯ ЗАДАЧА ПРАФЕСІЙНА ВЫКОНВАЕЦЦА»

Назіральнікі на выбарах Прэзідэнта расказалі журналістам пра ўражанні і вынікі сваёй работы

Аляксандр БАШКІН, назіральнік, намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве адзначыў тры фактары выбараў у Беларусі. Першы — пазітыўны, амаль святочны настрой выбаршчыкаў і выбарчых камісій, назіральнікаў.

«Другі фактар, вельмі важны, — адпаведнасць патрабаванням нацыянальнага выбарчага заканадаўства, так званым міжнародным выбарчым стандартам. Ні вялікіх, ні малых разыходжанняў з патрабаваннямі выбарчых стандартаў мы не сустрэлі», — сказаў назіральнік.

Трэці фактар, які выдзеліў Аляксандр Башкін — яўка. Ён адзначае вялікую актыўнасць грамадзян, асабліва ў першай палове дня.

«Тая колькасць выбаршчыкаў, якая наведала выбарчыя ўчасткі ўжо на гэты момант, сведчыць, што ўдзел беларусаў у сваіх выбарах актыўны», — сказаў Аляксандр Башкін.

Галоўнае патрабаванне, да якога, на яго думку, павінна імкнуцца і ўлада, і грамадства ў адносінах да выбараў, — зручнасць для выбаршчыкаў і празрыстасць. З гэтага, напрыклад, выходзяць і ў Расіі, дзе плануюць праводзіць выбары ў некалькі дзён.

Нурбек САТВАЛДЫЕЎ, назіральнік, намеснік генеральнага сакратара Савета Міжпарламенцкай Асамблеі СНД — паўнамоцны прадстаўнік парламента Жагарку Кенеша Кыргызскай Рэспублікі расказаў, што ў такой якасці прыязджае ў Беларусь ужо другі раз — восенню быў на выбарах у Нацыянальны сход.

«Мне тады спадабалася. Сёння глядзім, назіраем. Па арганізацыі кампаніі я хацеў бы вельмі высокую ацэнку даць Цэнтральнай выбарчай камісіі, якая ў такім невялікім колькасным складзе арганізавала такія добрыя выбары і ў рэгіёнах, і ў сталіцы. Выдатная каманда. Пастаўленая задача прафесійна выконваецца», — сказаў назіральнік.

Нараканняў і заканадаўчых парушэнняў, па яго словах, няма. Нурбек Сатвалдыеў падзяліўся сваімі ўражаннямі ад краіны ўвогуле.

Сяргей МІЦІН, назіральнік, першы намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па аграрна-харчовай палітыцы і прыродакарыстанні канстатаваў, што на выбарах Прэзідэнта Беларусі створаны годныя ўмовы для галасавання.

Дэлегацыя міжнародных назіральнікаў наведала выбарчы ўчастак у Брэсцкім дзяржаўным музычным каледжы імя Рыгора Шырмы ў першыя хвіліны пасля яго адкрыцця.

«У нас даволі вялікая дэлегацыя ад Савета Федэрацыі. У Брэсце сёння наведаем восем участкаў. Мяркуючы па гэтым участку, арганізавана ўсё добра. Спадзяюся, што мы будзем сведкамі дэмакратычна праведзеных выбараў», — перадае словы Сяргея Міціна БелТА.

Сенатар дадаў: яму спадабалася, у адрозненні ад расійскіх выбарчых кампаній, што нідзе не валяюцца лістоўкі, усюды чысціня, парадак.

АПЫТАННІ ПАКАЗАЛІ

Паводле exit poll, пераважная большасць выбаршчыкаў аддала свае галасы дзеючаму кіраўніку краіны

Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў па замове нацыянальнага прадстаўніцтва Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» у Беларусі правяла нацыянальны exit poll (апытанне на выхадзе з выбарчых участкаў). Апытанне праводзілася на 320 участках па ўсёй краіне. Інтэрв'юеры прапаноўвалі тым, хто прагаласаваў, прайсці ананімнае апытанне. На пытанне аб тым, за каго рэспандэнт аддаў свой голас, адказалі 67,6 %, адмовіліся адказваць 32,4 %. Усяго было апытана 12 340 чалавек. Выбарка — шматступенная, камбінаваная.

Паводле exit poll Маладзёжнай лабараторыі, кандыдаты прадэманстравалі наступныя вынікі: Аляксандр Лукашэнка набраў — 79,7 %, Святлана Ціханоўская — 6,8 %, Ганна Канапацкая — 2,3 %, Андрэй Дзмітрыеў — 1,1 %, Сяргей Чэрачань — 0,9 %. Супраць усіх, паводле exit poll, прагаласавалі — 9,2 % выбаршчыкаў.

Апытанне рабіў таксама Аналітычны цэнтр Ecoom. Даследаванне праводзілася ў асноўны дзень выбараў па тэлефоне. Рэспубліканская выбарка склала 2817 рэспандэнтаў, статыстычная хібнасць не перавышае 2,5-4 %. Электаральныя перавагі грамадзян размеркаваліся наступным чынам: Аляксандр Лукашэнка — 78,9 %, Святлана Ціханоўская — 7,1 %, Ганна Канапацкая — 2,1 %, Андрэй Дзмітрыеў — 0,9 %, Сяргей Чэрачань — 0,8 %, супраць усіх — 10,2 %. Аналіз вынікаў праведзенага аналітычным цэнтрам Ecoom па замове ЗАТ «Другі нацыянальны канал» сацыялагічнага апытання сведчыць пра высокі інтарэс насельніцтва да выбарчай кампаніі.

Па замове канала СТБ праводзілася яшчэ адно апытанне. Спецыялісты цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДУ апытвалі выбаршчыкаў на 160 участках Мінска і Мінскай вобласці. Расказаць пра свае электаральныя перавагі магадзіліся прыкладна дзве траціны рэспандэнтаў. Аляксандр Лукашэнка, паводле апытання, набраў 71,4 %, Святлана Ціханоўская — 10,1 %, Ганна Канапацкая — 2,4 %, Андрэй Дзмітрыеў — 1,6 %, Сяргей Чэрачань — 1,4 %. Супраць усіх, па выніках exit poll, прагаласавалі 13,1 % выбаршчыкаў.

Паводле БелТА.

Выбары. Погляд прафесіяналаў

У дзень выбараў меркаваннямі і прагнозамі з журналістамі падзяліліся эксперты

Аляксандр ШПАКОЎСКІ: КАНСТЫТУЦЫЙНЫ ЛАД ВЫСТАІЦЬ

На думку палітолага, сёлетняя выбарчая кампанія была дастаткова складаная — у першую чаргу праз выкарыстанне канкурэнтамі дзеючай улады палітычных тэхналогій, з якімі Беларусь раней не сутыкалася.

«Адразу ж сутыкнуліся з вельмі агрэсіўнымі паводзінамі апанентаў: выкарыстоўвалася тэхналогія кібербулінгу (калі людзі, якія адкрыта выражаюць прабеларускую, прадзяржаўную пазіцыю ў сацыяльных сетках, у коле сваіх зносін пачыналі сутыкацца з пагрозамі, ціскам, абразамі). Усё гэта было накіравана на тое, каб зачысціць інфармацыйную прастору і каб там патрыятычнага пункту гледжання не засталося ў прынцыпе», — растлумачыў эксперт.

Яшчэ адзін новы момант — сацыяльныя сеткі. Па словах палітолага, ужо ў 2017 годзе было відаць з'яўленне цэлай сеткі рэсурсаў, палітычных блогаў. Падыход у іх неаматарскі, працуе высокапрафесійная каманда з добрым фінансаваннем. У выніку YouTube- і тэлеграм-каналы сталі асноўнымі крыніцамі распаўсюджвання дэструктыўнай інфармацыі.

Акрамя таго, першапачаткова шэраг кандыдатаў звярнуўся да тактыкі стварэння ілюзіі большасці, калі прыхільнікам укідваецца ідэя аб тым, што іх абсалютная большасць, у Прэзідэнта рэйтынг надзвычай нізкі, а выбары яны ўжо выйгралі (калі яшчэ рэгістрацыя не скончылася).

«Асобныя рэсурсы заявілі, што кампанія зроблена, «нас 97 працэнтаў», застаецца толькі адстаяць перамогу — на вуліцы. Потым уладзе ўдалося ўзяць сітуацыю пад кантроль, галоўнай крыніцай і галоўным пастаўшчыком навін стаў дзеючы Прэзідэнт», — нагадаў Аляксандр Шпакоўскі.

Шэраг дзеянняў Аляксандра Лукашэнкі кшталту правядзення парада 9 Мая, Паслання, інтэрв'ю ўкраінскаму журналісту не застаўся незаўважаным і дазволіў пераламіць сітуацыю на карысць дзеючай улады.

«Таму мой прагноз, што канстытуцыйны лад Беларусі выстаіць, Прэзідэнт пераможа ў першым туры. Акцыі пратэсту і выхад нязгодных на вуліцы будуць, але ў дзяржавы дастаткова сіл і сродкаў, каб забяспечыць бяспеку, правапарадак. І я вельмі спадзяюся, што ўдасца і пазбегнуць надзвычайнага ціску на тых, хто пратэстуе, і ўтрымаць людзей у рамках прававога поля. Таму што права на пратэст ёсць — іншае пытанне, што яны не маюць права парушаць закон», — падкрэсліў палітолаг.

Аляксей ДЗЕРМАНТ: СУР'ЁЗНЫХ АБВАСТРЭННЯЎ НА ЗАХОДНІМ КІРУНКУ НЕ БУДЗЕ

Навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі ўпэўнены: з унутранай абстаноўкай у краіне ўлада і праваахоўнікі справяцца. Цікавыя сюжэты могуць разгарнуцца пасля выбараў у міжнародным сэнсе, перш за ўсё ў адносінах з Расіяй.

«Камунікацыя двух прэзідэнтаў апошнім часам многія пытанні і напружанні здымае. Пуцін заявіў пра тое, што не варта разгойдваць лодку, бо мы ўсе ў ёй сядзім і, адпаведна, мы ў адной камандзе. З гэтага я раблю вывад, што насамрэч сляды, якія, магчыма, цягнуліся да часткі палітыкафарміруючых колаў у Расіі, — гэта не пазіцыя Крамля, а асобныя прыватныя інтарэсы. І непасрэдна кантакт нашых прэзідэнтаў гэта толькі пацвярджае», — разважае Аляксей Дзермант.

На думку навукоўца, сілы, зацікаўленыя ў разгойдванні сітуацыі ў краіне, іграюць у выніку і супраць інтарэсаў Расіі. Таму вучоны ўпэўнены, што яны атрымаюць па заслугах у абедзвюх краінах. Адносіны ж Беларусі і Расіі вострых перыяд перажывуць, і далей дзяржавы будуць займацца інтэграцыйным працэсам.

«Заходняя рэакцыя ў дадзеным выпадку другасная. Нейкага вострага інтарэсу, ажыятажу ў заходніх палітыкаў нашы выбары не выклікаюць, таму, думаю, адбудзецца прадказальнае прызнанне дэ-факта выніку выбараў і працягнецца звычайная камунікацыя паміж дзяржавамі», — прадказвае Аляксей Дзермант.

На яго думку, захад і Еўрасаюз у прыватнасці не зацікаўлены ў абвастрэнні адносін з намі і не збіраюцца даваць нейкія рэзкія ацэнкі. З заяў будучага пасла ЗША эксперт пры ўсіх звычайных заўвагах таксама не пачуў рэзкіх ацэнак.

«Выбары — гэта перш за ўсё беларуская ўнутраная справа. Вядома, ацэнкі партнёраў важныя, але легітымнасць улады трымаецца менавіта на выніках волевыяўлення беларускага народа. А калі мы будзем упэўненыя ў сваёй унутранай легітымнасці, то знешнія пляцоўкі раней ці пазней прызнаюць выбар, які зрабіў беларускі народ», — адзначыў эксперт.

Вадзім ГІГІН: ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА — САМАЯ ВАЖНАЯ ПАДЗЕЯ ГОДА

Палітолаг адзначае вельмі высокую актыўнасць выбаршчыкаў, у тым ліку на датэрміновым галасаванні. Яе Вадзім Гігін тлумачыць летнім перыядам, калі многія праводзяць выхадныя за горадам. А гэта яшчэ і час адпачынкаў.

Эксперт нагадаў вынікі даследавання Маладзёжнай лабараторыі пры Беларускім камітэце маладзёжных арганізацый: каля 90 працэнтаў лічаць выбары Прэзідэнта самай важнай падзеяй года — важнай асабіста для сябе.

«Жорсткая канкурэнцыя паміж штабамі ці групамі, якія стаяць за некаторымі кандыдатамі. Праціўнікі Аляксандра Лукашэнкі спрабавалі максімальна мабілізаваць пратэсны электарат, ён заўсёды ёсць. У апошнія тыдні актывізаваўся электарат дзеючага Прэзідэнта», — адзначыў палітолаг.

Па яго словах, гэтая кампанія вылучалася вялікай колькасцю фэйкавых сацыялагічных укідаў. Нацыянальны экзітпол дасць поўную афіцыйную інфармацыю.

«Прынцыпова важна, каб увесь выбарчы працэс праходзіў менавіта ў канстытуцыйных рамках. Гэта важна для кожнага грамадзяніна, для выбаршчыка, для кандыдатаў. Гэта безумоўна важна і для месца і іміджу Беларусі на міжнароднай арэне, і хацелася б, каб гэтыя выбары прайшлі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, мы спакойна аддалі свой голас, спакойна дачакаліся вынікаў і потым, як гэта і бывае, пракаментавалі, абмяняліся меркаваннямі», — падкрэсліў Вадзім Гігін.

Варвара МАРОЗАВА.

Бяспека: афіцыйна

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ НОЧЫ

У ноч на панядзелак па краіне былі адзначаны зборы людзей каля выбарчых участкаў і на цэнтральных плошчах 33 населеных пунктаў. Падрабязней пра падзеі, якія адбыліся на вуліцах гарадоў пасля закрыцця выбарчых участкаў, расказала прэс-сакратар МУС Вольга ЧАМАДАНАВА.

Фота Бел ТА.

— Усяго па краіне за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах было затрымана каля 3 тысяч чалавек. З іх тысяча — у Мінску і больш за дзве — у іншых рэгіёнах краіны. У выніку сутычак пацярпела больш за 50 грамадзян, а таксама 39 супрацоўнікаў міліцыі. Некаторыя з іх былі шпіталізаваныя.

У ведамстве дадалі, што ў Мінску прыкладна а 22-й гадзіне ў раёне стэлы «Мінск — горад-герой» пратэстоўцы запалівалі фаеры, раскідвалі на праезную частку шыпы, цвікі, узводзілі барыкады з мабільных турнікетаў, разбіралі тратуарную плітку і кідаліся ёй і іншымі прадметамі ў супрацоўнікаў міліцыі.

— Актыўнае супрацьстаянне праваахоўнікам было аказана ў Пінску. Там на супрацоўнікаў міліцыі спрабавала напасці група агрэсіўна настроеных людзей. Яны выкарыстоўвалі завостраныя калы, пруты, камяні і арматуру, — заявіла Вольга Чамаданава.

Яна звярнула ўвагу на тое, што частка людзей, якіх даставілі ў бальніцы, была ў стане алкагольнага ап'янення, і адзначыла, што баявая зброя не выкарыстоўвалася. Загінулых няма.

Старшыня Следчага камітэта Іван Наскевіч адзначыў, што па фактах масавых беспарадкаў і гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі заведзены крымінальныя справы.

— Былі адабраны запісы камер відэаназірання. Асобы, датычныя да беспарадкаў, або ўжо высветлены, або высвятляюцца. Дзеяннем іх усіх абавязкова будзе дадзена прававая ацэнка, заведзены крымінальныя справы па розных частках артыкула 293 Крымінальнага кодэкса. Адказнасць за гэтыя дзеянні адпаведна — да 8 і 15 гадоў пазбаўлення волі.

Іван Наскевіч заклікаў не паддавацца на правакацыі і заклікі да парушэння грамадскага парадку.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

• Дарэчы

Медыцынская дапамога спатрэбілася як праваахоўнікам, так і ўдзельнікам незаконных акцый. «На гэты момант на лячэнні знаходзіцца каля 40 супрацоўнікаў МУС і больш як 50 удзельнікаў вулічных акцый, — паведаміў учора пасля абеду **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.** — Стан усіх ацэньваецца як стабільны».

«На шчасце, абышлося без ахвяр», — падкрэсліў міністр, абвергнуўшы інфармацыю аб тым, што пад коламі спецаўтамабіля загінуў мужчына. Высветлілася, што 35-гадовы мінчанін, раней судзімы за хуліганства, спрабаваў заскочыць на аўтамабіль МУС, які рухаўся, і сарваўся. Яго даставілі ў бальніцу хуткай дапамогі, дзе дыягнаставалі чэрапна-мазгавую траўму лёгкай ступені, страсенне мозга, удар ніжняй губы, алкагольнае ап'яненне (аналіз паказаў у крыві 2,3 праміле алкаголю).

❍ ГРОДЗЕНШЧЫНА

«ЗА РЭФОРМЫ, АЛЕ МІРНЫМ ШЛЯХАМ»

Путрышкі — адна з найбліжэйшых да абласнога цэнтра вёсак. Ад Гродна — усяго кіламетраў пяць-шэсць. Такая блізкасць дае магчымасць многім жыхарам вучыцца і працаваць у Гродне. У іх ліку Таццяна Сямёнава, якая прыйшла на выбарчы ўчастак адна з першых. Жанчына доўгі час працавала на прадпрыемстве «Гродна Азот», цяпер на заслужаным адпачынку, займаецца хатняй гаспадаркай. Для яе галоўная каштоўнасць — гэта мір. Яна лічыць, што рэформы павінны адбывацца, але мірным шляхам.

Сям'я Юнцэвічаў прыйшла на ўчастак у поўным складзе. Яўген галасуе ўпершыню. Ён студэнт ГрГУ, летам займаецца падпрацоўкай. Спяшаліся на работу і бацькі. Ва ўсіх настрой з ранку бадзёры. Па словах маці, кожны самастойна вызначаўся, за каго аддаць свой голас на выбарах. Сама Ірына жадае сваім дзецям светлай будучыні, мірнага неба над галавой, каб не было ніякіх ваенных дзеянняў. Сын Яўген таксама з гэтым згодны. Яму як выбаршчыку, які прыйшоў на ўчастак упершыню, уручаныя памятны ліст і падарунак. Цікава, што Яўген галасуе на ўчастку, які называецца Маладзёжны.

Старшыня выбарчай камісіі Ірына ТОЎКАЧ расказала, што з 880 выбаршчыкаў 388 прагаласавалі датэрмінова. Паралельна праходзяць выезды членаў камісіі на дом. Ужо ахоплена больш за 100 чалавек. Выезды ажыццяўляюцца па меры паступлення зваротаў.

Упершыню галасуе і сын Наталлі і Вадзіма Ярэмічаў на суседнім участку № 30. Бацькі сказалі, што ён будзе пазней, затое прыйшлі з малодшай дачкой і пазітыўным настроем. Выбар рабілі разам, пры гэтым абмеркавалі кожнага кандыдата. Галасы вырашылі аддаць за стабільнасць і парадак. Наталля лічыць важнай для сваіх дзяцей магчымасць рэалізаваць сябе, працаваць і зябяспечваць сваю сям'ю, як гэта зрабіла яна з мужам. Сама Наталля працуе ў мясцовай гаспадарцы інжынерам-заатэхнікам. Тут сям'я атрымала жыллё як шматдзетная. А ў дзяцей ёсць магчымасць наведваць спартыўныя школы ў абласным цэнтры.

Жыхарка вёскі Жытомля Ірына Шляга прыйшла на свой выбарчы ўчастак № 8 таксама з ранку. Яна расказала, што асаблівых сумненняў, за каго галасаваць, не мела. Кандыдат, якому яна аддала свой голас, разумее народ, у тым ліку і вясковых жыхароў. «Гэта вельмі складаная і адказная работа, — заўважыла Ірына. — Гэта трэба разумець і нашай моладзі. Калі маладыя людзі не могуць самі зрабіць выбар, то вядуцца на розныя заклікі і абяцанні». Цяпер вёска прыкметна аднавілася, людзі тут жывуць ветлівыя і добразычлівыя, кажа суразмоўніца. Вядома, працэс старэння насельніцтва не мінае населены пункт, але гэта прыкмета часу. Між тым моладзь таксама прыходзіць працаваць у гаспадарку. Ірына сама доўгі час была супрацоўніцай моцнага сельскагаспадарчага кааператыва «Прагрэс-Верцялішкі». Яна лічыць, што ўсё прыходзіць з часам, трэба толькі жыць па сродках.

На выбарчым участку даволі высокая яўка. Амаль палова выбаршчыкаў галасавала датэрмінова. Гэта абумоўлена ходам сельскагаспадарчых работ, растлумачыла **старшыня Жытамлянскага ўчастка № 8 Людміла ЧЫЖЫК.** Кожны прыходзіў у вольны ад работы час.

Станіслава Лебядзевіч узяла на ўчастак трох ўнукаў. Менавіта ў гэты дзень яе сям'я сабралася разам. З кандыдатам Станіслава вызначылася даўно. Яна працуе на ферме чвэрць стагоддзя і бачыць, як мяняюцца ўмовы працы і аплата. Ад гаспадаркі атрымалі кватэру, прыватызавалі. І сын, і дачка таксама засталіся працаваць у сельгаскааператыве. «Дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся», — лічыць Станіслава.

Пасля працэдуры галасавання жанчына павяла сваіх унукаў у буфет, каб выбралі сабе пачастункі. На кожным участку у праграме — канцэрт на адкрытай пляцоўцы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота Мікалая ЛАПІНА.

❍ БРЭСТЧЫНА

«Усё спакойна, ніякіх заўваг»

На выбарчым участку № 17 у вёсцы Воўчын Камянецкага раёна зарэгістраваны 382 выбаршчыкі з шасці вёсак. Участак размешчаны ў будынку сельскага Савета. Зранку тут гучыць музыка. Пакрысе падыходзяць людзі.

— Найбольшая актыўнасць была з васьмі гадзін, — кажа **старшыня камісіі Ігар ДУЛЬКО.** — Вясковыя людзі ўстаюць рана: прагаласаваў і пайшоў-паехаў па справах. А тыя, хто ў выхадны дзень нікуды не спяшаецца, ідуць пазней.

Ігар Дулько першы раз працуе ў якасці старшыні выбарчай камісіі, таму крыху хвалюецца, хоць усё ідзе тут сваім парадкам. Участак да выбараў падрыхтаваны, аснашчаны сродкамі абароны ад інфекцый. Члены камісіі нагадваюць наведвальнікам пра магчымасць выкарыстання антысептыкаў. Самі працуюць у масках і па жаданні выбаршчыкаў выдаюць маскі ім. Скрыня для бюлетэняў празрыстая. На ўчастку дзяжураць супрацоўнік МНС, міліцыянер, медсястра з амбулаторыі. Старшыня камісіі паведаміў, што датэрмінова прагаласавалі 185 чалавек. 16 грамадзян пакінулі заяўкі аб галасаванні па месцы жыхарства.

Амаль насупраць сельвыканкама размешчаны храм. І як толькі звон апавяшчае завяршэнне службы, актыўнасць выбаршчыкаў узрастае. На ўчастак заходзяць жанчыны ў белых хусцінках. Яно і зразумела: спачатку сілкаванне для душы, а потым — грамадзянскі абавязак. Як самага жаданага госця сустракаюць на ўчастку 92-гадовую Ганну Лявоненка. Ганна Іванаўна — былая настаўніца. Многія з тых, хто працуюць у гэтым будынку, а таксама ў камісіі, — яе вучні.

Ганна Іванаўна расказала, што прыехала сюды за мужам, ветэранам вайны, які шмат гадоў быў дырэктарам школы ў Воўчыне. А сама яна 42 гады адпрацавала на ніве адукацыі. Выкладала, дарэчы, гісторыю і грамадазнаўства. Вось цяпер на прыкладзе работы камісіі можа ўпэўніцца ў якасці і трываласці ведаў, якія дала вучням.

Згадала Ганна Іванаўна, што ў свой час і сама не раз працавала ў камісіях па выбарах розных узроўняў, была і старшынёй камісіі. Пасля галасавання ветэран працы зазірнула ў кабінет да старшыні сельскага Савета Віктара Палешчука, свайго вучня. Віктар Пятровіч пазней паведаміў карэспандэнту, што Ганна Лявоненка — чалавек актыўнай грамадзянскай пазіцыі, шмат робіць для выхавання маладога пакалення.

Пакуль гаварылі з Ганнай Іванаўнай, якую суправаджала дачка, падышоў маладжавы пенсіянер Уладзімір Лук'яненка. Сказаў, што на выбары з даўніх часоў ходзіць галасаваць у асноўны дзень, а галасуе, вядома, за спакойную будучыню Беларусі, за мір, дабрабыт, росквіт.

На здымку: 92-гадовая Ганна ЛЯВОНЕНКА.

На сельскім выбарчым участку працуюць назіральнікі. Вольга Жыранок, вылучаная назіральнікам ад раённай арганізацыі прафсаюза аграпрамысловага комплексу, падзялілася сваімі ўражаннямі:

— Назіраю не першы дзень за працэсам галасавання, ніякіх заўваг да камісіі не магу выказаць. Усё праходзіць спакойна, па-дзелавому, у рамках закону.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Камянецкі раён.

❍ ВІЦЕБШЧЫНА

«Мы ведаем цану міру»

Па традыцыі старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ прагаласаваў у Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, дзе калісьці вучыўся.

Сёлета, як заўсёды падчас выбараў, губернатар прыйшоў на ўчастак каля васьмі гадзін раніцы, якраз да адкрыцця. Але прагаласаваў не першы. Да яго свой выбар упершыню ў жыцці зрабіла студэнтка трэцяга курса акадэміі Ангеліна Семянкевіч. Дзяўчына нават разгубілася, калі журналісты літаральна займалі чаргу, каб пагутарыць з ёй. У яе аднакурсніцы Аляксандры Дубінкі таксама было шмат інтэрв'ю ды хваляванняў.

Кіраўнік выканаўчай улады Прыдзвінскага краю павіншаваў студэнтак са значнай падзеяй у іх жыцці. Пацікавіўся, чым захапляюцца, спытаў: можа чагосьці не хапае, каб з карысцю для інтэлекту і здароўя бавіць час? Агучыў прыклады, калі іх равеснікі з'язджалі за акіян «па ўдачу», але вярталіся на Радзіму, і ўпэўніваліся, што тут можна праявіць сябе і дзякуючы ведам, працаздольнасці, прафесійнаму росту дабіцца многага.

Каментуючы ход выбараў у Віцебскай вобласці, Мікалай Шарснёў падкрэсліў, што галоўнае — мірная палітыка. Мы ведаем цану міру і не хацелі б, каб выбухалі снарады, свісталі кулі. А што да ўзроўню жыцця — тут многае залежыць ад нас, падкрэсліў губернатар. І выказаў надзею на тое, што землякі зробяць правільны выбар.

Былі тут і назіральнікі ад місіі СНД. Адзін з іх — Аляксандр Серавін, які займаецца навуковай дзейнасцю ў галіне паліталогіі. Ён — кіраўнік лабараторыі электроннай электаральнай палітыкі ЛДУ імя А. Пушкіна. Сказаў, што «ўзяў на аловак» наступнае: у нас людзям з праблемамі зроку даецца магчымасць атрымаць максімум інфармацыі для выбаршчыка. Такога ў Расіі няма. Таксама ўразілі чысціня і прыгажосць Віцебска.

У часовым буфеце ўчастка, як і заўсёды падчас такіх мерапрыемстваў, арганізавалі багаты выбар прадукцыі: ад шашлыкоў да пірагоў. Цэны парадавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

❍ ГОМЕЛЬШЧЫНА

«У 7.30 ужо стаялі на прыступках»

У Гомельскай вобласці за пяць дзён датэрміновага галасавання 54,44 % выбаршчыкаў аддалі свае галасы за абраных кандыдатаў. Гомельшчына — лідар сярод рэгіёнаў краіны па актыўнасці людзей у гэты перыяд галасавання. Сёння, у асноўны дзень выбараў, на ўчастках таксама адзначаецца вельмі актыўная яўка.

Тры пакаленні сям'і КОНЧЫЦ прыйшлі на выбары.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ прыйшоў аддаць свой голас за кандыдата на выбарчы ўчастак № 20 Цэнтральнага раёна Гомеля, размешчаны ў корпусе ГДУ імя Ф. Скарыны.

— Я галасую за ажыццяўленне нашых планаў. Напрыклад, за заканчэнне будаўніцтва дзвюх школ, лячэбнага корпуса абласной туберкулёзнай бальніцы, годнае завяршэнне ўборачнай кампаніі. Таксама галасую за нараджэнне здаровых дзяцей, стварэнне сем'яў, за парадак, мір у дамах і на вуліцах, спакой у нашай краіне, — выказаў сваю пазіцыю кіраўнік рэгіёна.

Генадзь Салавей павіншаваў маладых людзей, якія ўпершыню бралі ўдзел у выбарах, і ўручыў ім памятныя падарункі.

Урач Гомельскай абласной туберкулёзнай бальніцы Яўгенія Жлоба прыйшла на выбарчы ўчастак у школу № 60 пасля дзяжурства.

— Я добра ведаю, якія цяжкія выпрабаванні выпалі на долю нашай краіны ў апошнія шэсць месяцаў. Мы ўсе аб'ядналіся і справіліся з каранавіруснай інфекцыяй. Вялікая заслуга кожнага чалавека і ўсяго народа ў тым, што мы можам бяспечна аддаць свой голас... Я аддаю свой — за спакой, светлую будучыню квітнеючай Беларусі, за магчымасць добра жыць і дастойна працаваць у сваёй краіне, — падзялілася спецыяліст, маці дваіх дзяцей.

Да выбарчага ўчастка № 6, што ў будынку сярэдняй школы № 29 Гомеля, цягнецца няспынны паток людзей. Сярод выбаршчыкаў — сталыя пары сужэнцаў, сем'і з дзецьмі, шмат моладзі.

Маладая гамяльчанка Вольга Гатальская апускае бюлетэнь у скрыню, потым з задавальненнем затрымліваецца, каб сказаць некалькі слоў пра ўдзел у выбарах. Кажа, што вельмі хвалявалася, бо для яе гэта вельмі сур'ёзная і адказная падзея:

— Я прыйшла аддаць свой голас за развіццё, за добрыя перамены.

Маці дваіх дзяцей, а цяпер і шчаслівая бабуля — Наталля Мікалаеўна Кончыц — прывяла на выбары ўсю сваю вялікую сям'ю:

— Марым пра тое, каб горад наш квітнеў і далей, пра шчаслівую будучыню для нашых дзяцей, за тое і галасуем, — дзеліцца меркаваннем гамяльчанка, для якой браць удзел у выбарах — сямейная традыцыя.

Актыўны ўдзельнік усіх патрыятычных мерапрыемстваў у абласным цэнтры і Гомельскай вобласці, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксей Іванавіч Піменаў на выбарчым участку № 6 прысутнічае ў якасці назіральніка. Арганізацыю галасавання ацэньвае на «выдатна»:

— Вельмі строга ўсё і дакладна, згодна з пратаколам. Што датычыцца маёй асабістай пазіцыі, то я — шчыры і нязменны прыхільнік дзеючага Прэзідэнта, — зазначае 94-гадовы гамяльчанін.

Між тым на ўчастках для галасавання акцэнтуецца ўвага на выкарыстанні ахоўных сродкаў. Усіх папярэджваюць аб пажаданым захаванні сацыяльнай дыстанцыі, гэта адзначае таксама назіральнік названага выбарчага ўчастка Ігар Ціток. Малады чалавек — электраманцёр на прадпрыемстве ААТ «Карал», дагэтуль двойчы назіральнік на выбарах дэпутатаў. На выбарах Прэзідэнта ў яго дэбют:

— Вельмі высокая яўка выбаршчыкаў была на датэрміновым галасаванні. У асноўны дзень таксама шматлюдна. Ніякай «напружанкі», праходзіць усё вельмі спакойна. Ідуць галасаваць і сталыя людзі, і моладзь, — зазначае Ігар Ціток і акцэнтуе ўвагу на наладжаным дзяжурстве спецыялістаў-медыкаў: перад пачаткам работы ў назіральнікаў і членаў выбарчай камісіі вымяраюць тэмпературу, а ў кабінках для галасавання своечасова праводзіцца апрацоўка паверхняў.

У Гомельскі абласны дом навучэнцаў і работнікаў устаноў прафадукацыі, дзе размясціўся ўчастак № 41, першыя выбаршчыкі прыйшлі яшчэ да адкрыцця.

Пажылыя сужэнцы Васіль і Вера Дзмітрачэнкі раней за ўсіх апусцілі бюлетэні ў скрыню для галасавання.

— Унутраны будзільнік спрацаваў — трэба збірацца галасаваць! Прыйшлі першыя — у 07:30 ужо стаялі на прыступках. Ды хіба гэта рана? Калісьці займалі чаргу, каб да шасці раніцы прагаласаваць, — прызналіся пенсіянеры.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

❍ МІНШЧЫНА

«За дабрабыт — каб мацней год ад года»

Каля васьмі гадзін раніцы 9 жніўня на ганку будынка Бараўлянскага сельскага Савета дэпутатаў пачалі збірацца людзі. Менавіта тут размяшчаецца ўчастак для галасавання № 18. Адкрыцця яго чакалі некалькі чалавек. Іншыя пачалі падцягвацца пазней.

— Усяго ў нас выбаршчыкаў 1555, у тым ліку 10 чалавек, якім споўнілася 18. Яны атрымаюць віншавальныя паштоўкі і падарункі, — расказала **старшыня ўчастковай камісіі Кацярына ХМЫЛКОВА.**

Асобны падарунак Кацярына Рыгораўна ўручыла і юбіляру. — Ларыса Генадзеўна 9 жніўня адзначае 60-годдзе. Жанчына падзякавала старшыні і членам выбарчай камісіі за ўвагу.

Галасаванне, як кажуць, прайшло ў штатным рэжыме, спакойна, без эксцэсаў. Было відаць, што людзі ідуць у прыўзнятым, святочным настроі.

— За што галасавалі? — пацікавілася ў мілавіднай жанчыны.

— За стабільнасць, — упэўнена адказала Лідзія Каваленка.

— Мне хутка споўніцца восемдзесят гадоў, — уступіла ў размову Ганна Іванаўна.

— Чаму ж не выклікалі членаў камісіі на дом? — пытаюся ў яе.

— Навошта людзей турбаваць? Я пакуль яшчэ здольная і сама дабрацца да ўчастка. А галасаваць буду за дабрабыт, каб ён мацнеў год ад года, каб раслі зарплаты. Думаю, пенсіі таксама паступова будуць павялічвацца.

— Мы прагаласавалі за тое, каб нашым нашчадкам жылося лепш. Прагаласавалі за росквіт і незалежнасць нашай краіны, — спыніліся побач Іван Аляксандравіч і Ганна Сцяпанаўна. — Мы раніцай нават унукаў разбудзілі, каб яны прыйшлі і зрабілі свой выбар.

На тэрыторыі Бараўлянскага сельсавета створана 29 выбарчых участкаў, прычым у гэтую кампанію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дадаткова адкрыта сем новых.

— Гэта звязана перш за ўсё з тым, што кожны год у нас прырост насельніцтва складае каля чатырох тысяч. Сярод іх і людзі, якія дасягаюць 18-гадовага ўзросту і маюць права ўдзельнічаць у галасаванні, — канстатуе **старшыня Бараўлянскага сельскага Савета дэпутатаў Жанна ВАРАБЕЙ**. — З гэтых 29 участкаў шэсць закрытых. Яны размешчаны ва ўстановах аховы здароўя для галасавання хворых, якія знаходзяцца на момант правядзення выбараў на лячэнні. Рэалізаваць сваё права пацыенты могуць у асноўны дзень галасавання — 9 жніўня. Дзевяць выбарчых участкаў знаходзяцца ва ўстановах адукацыі. Адзін — ва ўстанове культуры. Астатнія — у інтэрнатах, службовых памяшканнях садовых таварыстваў. Мы фарміравалі ўчасткі і падбіралі памяшканні для іх з улікам таго, каб людзям было зручна дабірацца.

Усяго ж на тэрыторыі сельсавета маюць права ўдзельнічаць у галасаванні больш за 46 тысяч чалавек, у тым ліку 400 маладых людзей, якія дасягнулі 18 гадоў, 10 выбаршчыкаў, што адзначаюць той ці іншы юбілей з дня нараджэння. Ну, а да тых, хто па стане здароўя не можа з'явіцца на выбарчы ўчастак, члены камісіі выедуць дадому.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

❍ МАГІЛЁЎШЧЫНА

«ЗРАБІЦЬ ВАЖНЫ ВЫБАР»

У Магілёве з самай раніцы актыўна ішло галасаванне. Прыходзілі цэлымі сем'ямі. Людзей забяспечвалі аднаразовымі пальчаткамі, медыцынскімі маскамі, антысептыкам. Працавалі буфеты і кірмашы.

— Настрой святочны. Прагаласаваў за тое, каб у нашай краіны была мірная і шчаслівая будучыня. Гэта каштуе дорага, — падзяліўся ўражаннем **ваенны камісар Магілёўскай вобласці, палкоўнік, старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі РАА «Белая Русь» Аляксандр ГАРОШКІН,** які прыйшоў на выбарчы ўчастак № 76 пасля 10 гадзін раніцы.

Дарэчы, як адзначалі члены гэтай выбарчай камісіі., першыя наведвальнікі прыйшлі загадзя і чакалі, пакуль участкі адкрыюцца, каб прагаласаваць хутчэй. Нават чарга ўтварылася.

Выбары сталі знакавай падзеяй і для 100-гадовай магіляўчанкі Матроны Каленька, якая галасавала дома за тое,каб яе дзеці і ўнукі жылі ў квітнеючай краіне. Да яе завіталі члены камісіі з выбарчага ўчастка № 76, які размешчаны ў Доме ветэранаў.

Матрона Герасімаўна — паважаны чалавек. Пасля вайны прыйшла працаваць медсястрой у радзільнае аддзяленне і шчыравала там да 70 гадоў. Узнагароджана Ганаровымі граматамі. Яна мае траіх дзяцей, мае пяць унукаў і дзевяць праўнукаў.

Шматдзетныя бацькі-магіляўчане Дзмітрый і Наталля Гурэевы прыйшлі галасаваць з двухгадовай Сафіяй і чатырохгадовай Насценькай. Дома са сваякамі засталіся астатнія трое дзетак.

— Сёння для нас двайное свята — дзень выбараў і дзень нараджэння ў сямігадовай дачкі Паліны. Таму 9 жніўня для нас знакавы дзень, — кажа матуля. — У нас вялікая сям'я. Мару, каб дзеткі выраслі добрымі людзьмі і мы ганарыліся імі.

Пра тое, што ўдзел у выбарах — святы абавязак для кожнага, не раз паўтаралі і ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Так, Герасім Бераснёў прыйшоў галасаваць разам са сваёй другой палавінкай.

— Мы пралівалі кроў на вайне. Як ніхто іншы ведаем цану міру. Яго варта захаваць у нашай роднай Беларусі. Сёння мы выбіраем гаспадара для краіны. Варта зрабіць правільны выбар, — падкрэсліў ветэран.

Таццяна МАЛІНІНА, фота аўтара.

Прыёмная кампанія – 2020

ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН ПАЛЬМУ ПЕРШЫНСТВА НЕ САСТУПІЎ

У БДУ і БДУІР па шэрагу спецыяльнасцяў былі пабіты леташнія рэкорды прахадных балаў

Так, істотны іх рост быў адзначаны на факультэце міжнародных адносін (ФМА) і факультэце філасофіі і сацыяльных навук (ФФСН). На групу з дзвюх спецыяльнасцяў профілю «Міжнародныя адносіны» па аб'яднаным конкурсе залічаны 22 абітурыенты, прахадны бал склаў 382 (у 2019 годзе — 379). На спецыяльнасць «Міжнароднае права» прахадны бал быў 386 (у 2019 годзе — 385), «Міжнародныя адносіны» — 382 (у 2019 годзе — 379).

На спецыяльнасць «Лінгвакраіназнаўства» залічаны 14 абітурыентаў. Прахадны бал — 382 (у 2019 годзе — 378). Чатыры абітурыенты залічаны без іспытаў.

На спецыяльнасць «Мытная справа» залічаны 17 чалавек, з іх пяць без іспытаў і шэсць па мэтавым прыёме. Прахадны бал — 357.

На групу з дзвюх спецыяльнасцяў эканамічнага профілю факультэта міжнародных адносін па аб'яднаным конкурсе залічаны 20 абітурыентаў, прахадны бал — 362. На асобных спецыяльнасцях склаліся наступныя прахадныя балы: «Сусветная эканоміка» — 372; «Менеджмент» (кірунак — менеджмент у сферы міжнароднага турызму) — 362. Усяго на ФМА залічана 67 «бюджэтнікаў».

Студэнтамі факультэта філасофіі і сацыяльных навук сталі 64 чалавекі. На групу з трох спецыяльнасцяў па аб'яднаным конкурсе залічаны 34 абітурыенты, з іх адзін абітурыент паступіў без экзаменаў. Прахадны бал па аб'яднаным конкурсе — 342 (у 2019 годзе — 328). Па асобных спецыяльнасцях прахадныя балы склалі: «Сацыяльныя камунікацыі» — 363 (у 2019 годзе — 344), «Сацыялогія» — 344 (у 2019 годзе — 330), «Філасофія» — 342 (у 2019 годзе — 328), «Псіхалогія» — 344 (у 2019 годзе — 337), «Сацыяльная работа» — 296 (у 2019 годзе — 289).

На факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій па спецыяльнасцях аб'яднанага конкурсу дзённай формы навучання залічаны 205 абітурыентаў, з іх адзін прыняты без экзаменаў. Прахадны бал склаў 291. На асобных спецыяльнасцях прахадныя балы наступныя: «Камп'ютарная бяспека» (кірунак — радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі) — 314, «Прыкладная інфарматыка» (кірунак — інфармацыйныя тэхналогіі тэлекамунікацыйных сістэм) — 317, «Радыёфізіка» — 296; «Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» — 307, «Фізічная электроніка» — 291.

На факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі па аб'яднаным

конкурсе залічаны 276 абітурыентаў, прахадны бал склаў 328. Сярод залічаных 24 прыняты без экзаменаў. Прахадныя балы па спецыяльнасцях і кірунках: «Прыкладная інфарматыка» (кірунак — праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм) — 353, «Інфарматыка» — 352, «Актуарная матэматыка» — 328, «Камп'ютарная бяспека» (кірунак — матэматычныя метады і праграмныя сістэмы) — 342, «Прыкладная матэматыка» — 331, «Эканамічная кібернетыка» — 328.

У БДУІР самы высокі прахадны бал на бюджэтнай форме навучання — 366.

Ці змянілася тройка лідараў? Самай папулярнай стала спецыяльнасць «Электронны маркетынг» на інжынерна-эканамічным факультэце, а летась былі «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» на факультэце інфармацыйных тэхналогій і кіравання (364 бала). Сёлета гэтая спецыяльнасць заняла другі радок: каб паступіць туды, трэба было мець сама меней 365 балаў. Летась прахадны бал на «Электронны маркетынг» быў 363, а на спецыяльнасць «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» — 364.

Тройку лідараў замыкае «Эканоміка электроннага бізнесу» на інжынерна-эканамічным факультэце з 363 баламі (у 2019 годзе — 358). Летась на трэцяй пазіцыі была спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (факультэт камп'ютарных сістэм і сетак): 360 балаў у 2019 годзе і 358 — у гэтым. Цяпер гэта ўжо чацвёртая пазіцыя.

Максімальны бал, з якім былі пададзены дакументы, — 396. Іх уладальніца — выпускніца Лунінецкай гімназіі Валерыя Рамановіч — падала свае дакументы на «Эканоміку электроннага бізнесу». Летась максімум склаў 390 балаў.

Мінімальны прахадны бал і ў папярэднім, і ў гэтым годзе склаўся на спецыяльнасці «Электронныя і інфармацыйна-кіруючыя сістэмы фізічных установак». Каб сюды паступіць, дастаткова было набраць 257 балаў (у 2019 годзе — 296).

Усяго на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі залічаны 1060 абітурыентаў. Завочна атрымліваць адукацыю будуць 30 студэнтаў. Без экзаменаў быў залічаны 21 чалавек, сярод іх пятнаццаць з'яўляюцца пераможцамі рэспубліканскіх алімпіяд, а шэсць замежных грамадзян залічаны без уступных выпрабаванняў у рамках міжнародных пагадненняў.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота з сайта bsuir.by

СТАРОНКІ НАШАЙ ГІСТОРЫІ

Канферэнц-залы мінскага Дома кнігі «Светач» ледзь хапіла для ўсіх, хто хацеў прысутнічаць на прэзентацыі цікавага праекта, арганізаванага Прэзідэнцкай бібліятэкай, Міністэрствам інфармацыі, Міністэрствам адукацыі, газетай «СБ. Беларусь Сегодня» і аналітычным агенцтвам Ecoom. Прысутныя размясціліся таксама і ў блізкай зале са стэндамі, дзе былі выстаўленыя кнігі, пра якія расказвалі выступоўцы.

Такая выстаўка кніг ладзілася тут з нагоды знаёмства з праектам «Гордасць ЗА Беларусь», мэтай якога было на прыкладах з розных сфер жыцця яскрава паказаць перамены ў жыцці Беларусі за гады яе незалежнасці. Сумесны праект пераканаўча адлюстраваў дасягненні ва ўсіх галінах, пазнаёміў з этапамі развіцця дзяржавы. Большасць выданняў і ўзораў плакатнай прадукцыі дэманстравалі высокі ўзровень айчыннай друкарскай базы.

Асобую цікавасць выклікалі выданні, падораныя ў свой час Прэзідэнту Рэспублікі Беларусі вядомымі пісьменнікамі, публіцыстамі. З выданнямі, якія апавядаюць пра абаронцаў Айчыны, пазнаёміліся самі вайскоўцы. Вучоныя і спецыялісты расказалі пра кніжныя навінкі адпаведных галін.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

Жніво

ДЗЕД МАРОЗ У ПОЛІ

Арыгінальны спосаб віншавання механізатараў з працоўнымі перамогамі прыдумалі ў жабінкаўскай гаспадарцы

Старэйшыя памятаюць, што ў савецкія часы была традыцыя спраўляць на вытворчасці Новы год, скажам, у верасні ці лістападзе. Гэта адбывалася тады, калі нейкі вялікі альбо маленькі калектыў выконваў гадавы план датэрмінова. Найчасцей ёлку ў цэх прыносілі завадчане альбо шахцёры, часам доменшчыкі. Тады іх чакалі слава і грошы. Нярэдка ўдарнікі станавіліся героямі тэле- і радыёсюжэтаў, траплялі на першыя старонкі газет.

Цяпер так не прынята. Ды і, напрыклад, хлебаробы па вызначэнні не могуць завяршыць год датэрмінова, бо сельгасвытворчасць цесна звязаная з прыродным цыклам. Іншая рэч, ушаноўваць перадавікоў хлебнай нівы... Герояў дня — тысячнікаў або двухтысячнікаў — звычайна вітаюць прадстаўнікі мясцовай улады, кіраўнікі грамадскіх арганізацый, шэфы з горада. А вось у ААТ «Вазнясенскі» Жабінкаўскага раёна вырашылі сваіх камбайнераў і шафёраў не проста адзначыць падарункамі і матэрыяльнай дапамогай, а і настрой ім узняць. Да іх на поле завітаў... Дзед Мароз з халоднай мінералкай і марозівам. У трыццаціградусную спёку гэта аказалася тое, што трэба.

Зімовы госць эфектна з'явіўся проста пасярод мора залатых каласоў у чырвоным атласным касцюме і адразу выклікаў усмешкі прысутных. Ну, а калі пажадаў, каб тэхніка не ламалася, надвор'е не падводзіла, а пад Новы год пад ёлкай кожны знайшоў чаканы падарунак, пазітыву яшчэ пабольшала.

Настрой, вядома, важны ў справе, якую робяць механізатары. Збіраюць гэтым летам у «Вазнясенскім» па 61 цэнтнеры збожжавых з гектара. А азімы ячмень выраснасць рэкордны — па 96 цэнтнераў! **Кіраўнік гаспадаркі Надзея КАНДРАЦЮК** вельмі ганарыцца сваім калектывам, лічыць, што ў самую гарачую пару, якой з'яўляецца ўборка, маральная падтрымка людзей таксама важная. Вось і прыдумалі гэтым разам візіт Дзеда Мароза ў поле. Налета будзе іншая фішка.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Дакладнасць і бяспека

І НАВАЛЬНІЦА, І ГРАД, І ШКВАЛ...

Фіксаваць небяспечныя з'явы і папярэджваць пра іх будзе радыёлакатар, які днямі запушчаны ў аэрапорце ў Гродне

Праект — частка сеткі метэаралагічных радыёлакатараў на тэрыторыі Беларусі, якая дазволіць стварыць адзінае радыёлакацыйнае поле і павялічыць дакладнасць штармавых прагнозаў, гарантаваць большую бяспеку палётаў грамадзянскай авіяцыі.

Доплераўскі метэаралагічны радыёлакатар устаноўлены ў аэрапорце Гродна за 18 кіламетраў ад горада і ўяўляе сабой металічную вежу вышынёй 31,5 метра. Наверсе знаходзяцца круглы модуль і антэна. Кантэйнер мае засцерагальнае зазямленне. Кошт аб'екта даволі высокі — 4,7 мільёна рублёў, з іх большая частка — затраты на абсталяванне.

Як адзначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір ДЗЯШКО,** надвор'е заўсёды цікавіць аграрыяў, дарожнікаў, будаўнікоў і наогул, усіх жыхароў. З уводам радыёлакатара прагнозы павінны палепшыцца і стаць больш дакладнымі.

Радыёлакатар дапаможа аператыўна адсочваць і прагназаваць змены надвор'я. З'явіцца магчымасць у рэжыме рэальнага часу атрымліваць інфармацыю аб месцазнаходжанні і перасоўванні вялікіх воблачных утварэнняў, а таксама ўзнікненні зон інтэнсіўных ападкаў. Можна дакладна фіксаваць зоны небяспечных з'яў, у тым ліку навальніц, граду, ураганаў, і сачыць за іх развіццём.

Падчас адкрыцця аб'екта **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэй ХУДЫК** падкрэсліў, што аб'ект доўгачаканы, бо працяглы час метэапрагнозы знаходзіліся на даволі нізкім узроўні, і гэта выклікала справядлівыя нараканні як з боку ўлад, так і з боку грамадскасці.

Фота Мікалая ЛАПІНА.

— Доўгія гады служба Белгідрамета не задавальняла нашых грамадзян і выклікала крытыку з боку кіраўніка дзяржавы. Яго даручэнне якраз і датычылася мадэрнізацыі службы — ад навучання кадраў да стварэння сеткі сучасных аб'ектаў для назіранняў за надвор'ем, — падкрэсліў Андрэй Худык.

Так была распрацавана дарожная карта мерапрыемстваў на 2018-2020 гады па павышэнні якасці прагнозаў надвор'я. У адпаведнасці з ёй, прадугледжаны ўвод у эксплуатацыю метэаралагічных радыёлакатараў у аэрапортах Віцебска, Гродна і Брэста. Дарэчы, у Брэсце адпаведны аб'ект мяркуецца ўвесці ў строй да канца года.

У дарожнай карце запланаваны пуск яшчэ сямі метэаралагічных станцый, якія будуць уведзены ў эксплуатацыю ў кастрычніку гэтага года. Колькасць такіх аб'ектаў з кожным годам павялічваецца: калі ў 2017-м іх у краіне было 38, прычым толькі палова аўтаматычныя, то да канца 2020-га гэтая лічба дасягне 70, і ўсе станцыі будуць працаваць у аўтаматычным рэжыме. Толькі за мінулы год аўтаматычныя метэаралагічныя станцыі ўведзены ў 15 гарадах, а таксама шэсць дадатковых у Мінску.

Таксама вядзецца мадэрнізацыя сетак і абнаўляецца камп'ютарная тэхніка. Завершана мадэрнізацыя праграмна-апаратных комплексаў авіяцыйных метэаралагічных станцый у пяці абласных цэнтрах краіны. Яны прызначаны для апрацоўкі і перадачы метэаралагічнай інфармацыі, праз авіяцыйную станцыю з аэрапорта Гродна ў Белгідрамет па лініі сувязі.

Што датычыцца падрыхтоўкі спецыялістаў Белгідрамета, то яны павышаюць сваю кваліфікацыю на базе вучэбных цэнтраў Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі, удзельніцай якой з'яўляецца і Беларусь. Акрамя таго, наша краіна — адзін з бакоў рамачнай Канвенцыі ААН па змяненні клімату, удзельніца Кіёцкага пратакола і падпісант Парыжскай дамовы. Таму Беларусь не можа заставацца ўбаку ад сусветнай глабальнай акцыі, мэта якой — не дапусціць у гэтым стагоддзі павышэння тэмпературы паветра на планеце больш чым на два градусы Цэльсія.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Надвор'е

«Эміль» верне прахалоду

Мінулыя выхадныя выдаліся дастаткова цёплыя. Слупок тэрмометра дасягаў адзнак у 24—30 градусаў. Агульную карціну псавалі хіба што навальнічныя дажджы, якія ў некаторых раёнах былі дастаткова моцныя.

На гэтым жа тыдні спякота адступіць і пахаладанне пачнецца ўжо сёння. Падрабязней пра сінаптычную абстаноўку паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак праз Беларусь будзе перамяшчацца малаактыўны атмасферны фронт. Дзякуючы гэтаму тэмпература панізіцца ўдзень да адзнак у 19—28 цяпла. Невялікія дажджы пройдуць толькі месцамі, ды і тое па поўдні.

А вось у сераду набярэ моц чарговы антыцыклон. Яму далі імя «Эміль». Сфарміраваны ён у халаднаватым паветры. Таму, прынамсі да выхадных, надвор'е не будзе адрозніваць разнастайнасцю. Уначы чакаецца ад 7 да 14 цяпла, прычым 13-га жніўня будзе ўсяго ад 5 да 10 са знакам «плюс». Затое ўдзень — ад 16 градусаў на паўночным усходзе да 24—25 на паўднёвым захадзе. Ападкаў не прагназуецца.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Інданезіі прачнуўся вулкан

На інданезійскім востраве Суматра актывізаваўся вулкан Сінабунг, 10 жніўня ён выкінуў у неба слуп попелу вышынёй 5 км. Аб гэтым паведамляе нямецкая тэлерадыёкампанія Deutsche Welle.

Цэнтр вулканалогіі і зніжэння геалагічнай небяспекі Інданезіі паведаміў, што ў выніку вывяржэння не зарэгістравана ні загінулых, ні пацярпелых.

Мясцовыя ўлады заклікаюць жыхароў і турыстаў пазбягаць знаходжання ў радыусе 5 км ад кратара, а таксама выпусціці папярэджанне аб магчымых патоках лавы. Работнік наглядальнага пункта на Сінабунгу паведаміў, што попел пакрыў ужо некалькі вёсак, якія размешчаны ў радыусе 20 км ад кратара.

У той жа час, паводле даных Упраўлення грамадзянскай авіяцыі Інданезіі, у рэгіёне прадаўжаюць ажыццяўляцца авіяпералёты.

Адзначаецца, што гэта другое за апошнія дні вывяржэнне Сінабунга, які з'яўляецца адным з больш чым 120 актыўных вулканаў Інданезіі. У час яго вывяржэння ў 2014 годзе загінулі 16 чалавек, у 2016-м — сем.

З-за турыстаў, якія не даехалі, Францыя страціла мільярды

Французская эканоміка не далічылася ад 30 да 40 млрд еўра з-за турыстаў, якія не прыехалі гэтым летам у краіну.

Аб гэтым заявіў дзяржсакратар па турызме Жан-Батыст Лемуан, паведамляе Radio France internationale.

У папярэднія гады сярэднія даходы ад турызму ў Францыі ацэньваліся ў сярэднім у 180 млрд еўра, 60 млрд з іх прыпадала на замежных падарожнікаў. Сёлета закрытыя граніцы і страх заразіцца або апынуцца на каранціне прымусілі многіх перагледзець свае прывычкі падарожнічаць. Аднак замежных гасцей часткова замянілі французскія адпачывальнікі, якія вырашылі не выязджаць гэтым летам за мяжу.

Кожнае лета ў Францыю прыязджае амаль 17 млн замежных турыстаў, а прыкладна 9 млн французаў адпраўляецца за мяжу. Улады разлічваюць, што турыстычнай галіне яшчэ ўдасца часткова аднавіцца ў гэтым сезоне за кошт турыстаў з Бельгіі, Германіі, Італіі і Іспаніі, якія звычайна адпачываюць у верасні.

У цэлым у свеце страты турыстычнай галіны ацэньваюцца гэтым летам у 320 млрд доларaў. Са студзеня да мая 2020 года колькасць міжнародных падарожжаў скарацілася на 56 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. Пад пагрозай скарачэння апынуліся ад 100 да 120 млн работнікаў сферы турызму. Такія даныя прыводзіць Сусветная турысцкая арганізацыя.

Мусонныя дажджы ў Пакістане: больш за 60 ахвяр

Сама меней 64 чалавекі сталі ахвярамі мусонных дажджоў і паводак у Пакістане за апошнія трое сутак, паведамляе ТАСС.

Паводле звестак пакістанскага Нацыянальнага ўпраўлення па барацьбе з наступствамі стыхійных бедстваў, найбольшая колькасць загінулых — у паўночна-заходняй правінцыі Хайбер-Пахтунхва. У рэгіёне парушана сувязь з затопленымі раёнамі, разліў рэк знішчыў сотні жылых дамоў, выклікаў абрушэнне мастоў і апор высакавольтных ліній электраперадачы.

У паўднёвай правінцыі Сінд прарыў плаціны на адным з каналаў прывёў да чалавечых ахвяр і затаплення некалькіх вёсак. Да эвакуацыі мясцовых жыхароў былі прыцягнуты армейскія падраздзяленні і верталёты. У зоне бедства ваенныя разгарнулі мабільны шпіталь, дзе аказваецца дапамога пацярпелым.

Дажджы паралізавалі нармальнае жыццё ў буйных пакістанскіх гарадах Карачы і Лахор. Вуліцы мегаполісаў затопленыя вадой, паводка значна ўскладніла работу транспарту і гарадскіх службаў.



Падобнае стыхійнае бедства церпіць і суседняя Індыя. Там з-за дажджоў і апоўзняў загінула больш за сорак чалавек.

ПЛАЦІЦЬ НЕЛЬГА АДМОВІЦЦА

Як абараняцца ад рыэлтараў, якія не хочуць працаваць па законе

Ліцэнзія агенцтва «Гатовыя рашэнні» скасавана, «Імперыі нерухомасці» — прыпынена, а «Тваёй сталіцы» выпісана прадпісанне. Гэта толькі частка пакаранняў, якія вынесены сёлета несумленным рыэлтарскім арганізацыям, супрацоўнікі якіх працягваюць пераступаць цераз закон. Сярод найбольш тыповых парушэнняў, як і раней, застаюцца неналежнае размяшчэнне рэкламы аб'ектаў перад або ўвогуле без заключэння дагавора на аказанне рыэлтарскіх паслуг, а таксама патрабаванне аплаты адначасова ад пакупніка і прадаўца. Як і чаму трэба абараняцца ад няякасных паслуг, растлумачылі ў Міністэрстве юстыцыі.

Двайная аплата і неналежная рэклама

Несвоечасовая рэгістрацыя дагавораў на паслугі ў кнізе рэгістрацыі і адсутнасць поўнай інфармацыі. Парушэнне парадку заключэння або прадаўжэння дагавораў абавязковага страхавання адказнасці рыэлтарскіх арганізацый. Несвоечасовае прадстаўленне ў Мінюст анкет для ўключэння звестак у Рэестр рыэлтараў Беларусі. Такія парушэнні ў дзейнасці беларускіх агенцтваў нерухомасці таксама не рэдкасць, падкрэслілі ў Міністэрстве юстыцыі.

— Летась Міністэрства юстыцыі атрымала ад грамадзян і юрыдычных асоб 100 зваротаў, якія датычыліся аказання рыэлтарскіх паслуг. У асноўным скаргі былі на аказанне паслуг, у тым ліку на размяшчэнне неналежнай рэкламы. Разглядаючы звароты, спецыялісты міністэрства арыентаваліся не толькі на абарону правоў і інтарэсаў спажыўцоў рыэлтарскіх паслуг, але і на папярэджанне аналагічных парушэнняў, — расказала **Вольга ШЫБКО, прэс-сакратар Міністэрства юстыцыі.** — Дзякуючы гэтай рабоце, а таксама «гарачай лініі», дзе грамадзянам даюць неабходныя тлумачэнні, колькасць зваротаў з цягам часу пакрысе змяншаецца. Так, у 2017 годзе ў Мінюст паступіла 130 зваротаў, у 2018-м — 102 і летась — 100.

21 зварот датычыўся прымусу патэнцыйных пакупнікоў да заключэння дагавораў на аказанне рыэлтарскіх паслуг і аплаты іх кошту. Гэта недапушчальнае парушэнне, якое мае на мэце атрыманне двайной аплаты паслуг: з прадаўца і пакупніка, што забаронена. Паколькі агенцтва заключае дагавор з прадаўцом, яно абавязана арганізоўваць прагляды аб'екта пакупнікам, не патрабуючы ад іх дадатковых дзеянняў, накшталт аплаты ці заключэння дагавораў.

Столькі ж скаргаў паступіла летась на размяшчэнне неналежнай, у тым ліку недакладнай рэкламы аб'ектаў нерухомасці. Прынамсі, рэкламаванне без заключэння дагавора паслуг, аб'явы аб арэндзе неіснуючай нерухомасці з мэтай прыцягнення кліентаў у агенцтва, а таксама размяшчэнне рэкламных прапаноў ад імя ўласніка, а не агента.

— 20 зваротаў датычыліся аплаты рыэлтарскіх паслуг і парадку іх аказання, у прыватнасці завышанага памеру кошту, аказання паслуг без заключэння пісьмовага дагавора, неправамоцнасці некаторых супрацоўнікаў аказваць пэўныя паслугі, — удакладніла прэс-сакратар. — У выніку разгляду асобных зваротаў пасведчанні аб атэстацыі некаторых рыэлтараў былі ануляваныя.

Сярод парушэнняў сустракаюцца зусім ганебныя факты. Спажывец замест адраса кватэры атрымліваў адрас офіснага будынка або даведваўся, што прапануемыя ў наём кватэры ўжо занятыя ці нават не планаваліся да здачы. Такія ж адказы можна было пачуць і па нумарах, якія давалі кліентам несумленныя рыэлтары. Былі і скаргі на тое, што спецыялісты агенцтва, якія суправаджалі здзелку, не абаранялі інтарэсы свайго кліента, нават калі было відавочна, што нерухомасць мела яўныя недахопы. А некаторыя «рыэлтары» ўвогуле не працавалі ў агенцтвах, аднак выконвалі абавязкі спецыялістаў па просьбе рыэлтарскіх арганізацый.

За вымаганне грошай — у суд

Агенцтва «Гатовыя рашэнні» пазбавілася ліцэнзіі 29 чэрвеня. Яшчэ летась арганізацыі выносілася прадпісанне аб устараненні выяўленых парушэнняў заканадаўства і патрабаванняў да ажыццяўлення рыэлтарскай дзейнасці. У арганізацыі было прыпынена дзеянне пластыкавых картак двух спецыялістаў па рыэлтарскай дзейнасці. Двум рыэлтарам (Капусцінскай і Матуцо) вынесены папярэджанні. Сёлета арганізацыі таксама двойчы выносіліся прадпісанні аб устараненні парушэнняў ліцэнзійных патрабаванняў і ўмоў, якія прад'яўляюцца да рыэлтарскай арганізацыі падчас аказання паслуг. Аднак яны засталіся без увагі. Як вынік — агенцтва засталося без работы.

Дзеянне ліцэнзіі агенцтва «Імперыя нерухомасці» з-за работы пры неадпаведнасці ліцэнзійным патрабаванням і ўмовам пакуль прыпынена: з 30 чэрвеня да 30 жніўня.

Не ўтрымалася ад спакусы і спадарыня Берташ — агент па аперацыях з нерухомасцю такога буйнога агенцтва, як «Твая сталіца». Спецыяліст парушыла правілы прафесійнай этыкі, і за гэта дзеянне яе ідэнтыфікацыйнай пластыкавай карткі агента па аперацыях з нерухомасцю прыпынена на два гады. Аказваць рыэлтарскія паслугі ў гэты час спецыялісту забаронена. А «Твая сталіца» як арганізацыя атрымала прадпісанне на ўстараненне выяўленых парушэнняў.

Падставай для разгляду матэрыялаў у дачыненні да агенцтва «Твая сталіца» стаў зварот пакупнікоў кватэры са скаргай на прымусовае заключэнне дагавора на аказанне рыэлтарскіх паслуг. Пры гэтым свае правы пакупнік адстаяла ў судзе, расказала **Дзіяна ПАДЛЕСКАЯ, начальнік упраўлення адвакатуры і ліцэнзавання юрыдычнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Паміж агенцтвам нерухомасці «Твая сталіца» і ўласнікам кватэры быў заключаны дагавор, у межах якога рыэлтарская арганізацыя абавязвалася арганізаваць рэкламную кампанію кватэры для пошуку пакупнікоў і агляд імі аб'екта. У пералік паслуг уваходзіла і папярэдняя работа з пакупніком, дапамога прадаўцу ў вядзенні перагавораў, арганізацыя падпісання бакамі дагавора аб намеры заключэння здзелкі куплі-продажу пры падборы варыянтаў, а таксама дапамога ў падрыхтоўцы дакументаў для выканання здзелкі. А вось пакупнікі, якія жадалі набыць гэтую кватэру, не былі абавязаны карыстацца паслугамі рыэлтарскай арганізацыі і заключаць з ёю дагавор.

Тым не менш, калі пакупнікі кватэры адмовіліся ад паслуг арганізацыі, агент заявіла, што адмяняе сустрэчу з прадаўцом, а на набыццё кватэры ёсць іншыя кліенты. На просьбу паведаміць нарматыўны акт, дзе быў бы прапісаны абавязак пакупніка карыстацца паслугай рыэлтарскай арганізацыі, спецыяліст тлумачэнняў даць не змагла і спаслалася на тое, што проста існуе такі парадак аплаты паслуг і прадаўцом, і пакупніком.

— Такім чынам агент «Тваёй сталіцы» парушыла правы і пакупніка, і прадаўца, — падкрэсліла прадстаўніца міністэрства. — Пакупнік вымушаны пагаджацца на ўмовы агента, каб набыць аб'ект, якім ён зацікавіўся, хоць рабіць гэта не абавязаны. А прадавец пазбаўляецца часткі патэнцыйных пакупнікоў, бо агенцтва дае магчымасць сустрэчы з гаспадаром толькі тым, хто гатовы падпісаць дагавор і заплаціць грошы за паслугу, якая ўжо была аплачана прадаўцом і ўваходзіць у дагавор паміж ім і агенцтвам.

У гэтай гісторыі пакупнікі былі вымушаны падпісаць дагавор, каб набыць упадабаны аб'ект, аднак пазней узніклі спрэчкі адносна аплаты паслуг, якія былі ўключаны ў прадмет дагавора. У прыватнасці, неабходнасць аддаць грошы за агляд кватэры; узгадненне ўмоў здзелкі; падрыхтоўка дакументаў, якія звязаны з пакупкай кватэры; падрыхтоўка дакументаў, якія звязаны з рэгістрацыяй кватэры. Пакупнікі сцвярджалі, што кватэру знайшлі самі ў інтэрнэце і з'ездзілі яе паглядзець. У выніку яны вырашылі заплаціць толькі за паказ кватэры і кансультацыю агента. «Твая сталіца» падала скаргу ў суд і выйграла яго.

Аднак прайграўшы бок, упэўнены ў сваёй праваце, дайшоў да Вярхоўнага суда, які і паставіў канчатковую кропку ў справе. Ён абвясціў, што пастановы, якія былі прынятыя раней, не могуць быць прызнаныя законнымі і падлягаюць адмене. Было ўстаноўлена, што пакупнікі знайшлі кватэру самастойна, аглядалі яе да заключэння дагавора, а значыць, гэтыя паслугі ў дагавор уключацца не маглі. Тым больш што яны ўжо былі аплачаны прадаўцом. Гэтаксама як і паслугі, якія звязаны з падрыхтоўкай дакументаў для здзелкі. Прынамсі, гэта першы выпадак, калі спажыўцу ўдалося даказаць у судзе сваю пазіцыю і выйграць спрэчку ў агенцтва.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рэкамендацыі па стасунках з агенцтвамі

Паколькі ў Мінюст працягваюць паступаць звароты ад грамадзян, дзе яны цікавяцца сваёй магчымасцю набыць аб'ект, які рэкламуецца агенцтвам, без заключэння дагаворных адносін патэнцыйнага пакупніка, у ведамстве раяць звяртаць увагу і ведаць наступныя рэчы.

Па-першае, згодна з п. 20 Правілаў ажыццяўлення рыэлтарскай дзейнасці (далей — Правілаў), зацверджаных Указам Прэзідэнта ад 9 студзеня 2006 г. № 15, рэкламаваць ці іншым спосабам размяшчаць інфармацыю аб аб'екце нерухомасці агенцтва можа толькі са згоды спажыўца і пасля заключэння з ім дагавора на аказанне рыэлтарскіх паслуг. Выходзячы з гэтага мяркуецца, што рэкламаванне рыэлтарскай арганізацыяй аб'екта нерухомасці з мэтай продажу ажыццяўляецца пры наяўнасці паміж агенцтвам і прадаўцом дагавора на аказанне паслуг рыэлтараў у садзейнічанні продажу.

— У межах дагавора арганізацыя выконвае свае абавязацельствы перад прадаўцом па пошуку патэнцыйных пакупнікоў, стварэнні ім умоў па аглядзе аб'екта, арганізацыі перамоў паміж прадаўцом і пакупніком, узгадненні ўмоў мяркуемай здзелкі, — падкрэсліла Дзіяна Падлеская. — Агенцтва павінна прымаць усе меры да якаснага выканання сваіх абавязкаў, а не шукаць толькі тых пакупнікоў, якія гатовы заключыць дагавор з арганізацыяй.

Вядомыя выпадкі, калі агент у адказ на адмову патэнцыйнага пакупніка на заключэнне дагавора паведамляе, што набыць маёмасць немагчыма, або здзелка проста наўмысна зрываецца. Каб абгрунтаваць сваю адмову ў паказе аб'екта ці сустрэчы з прадаўцом, агенты, здараецца, спасылаюцца на нібыта ўласнае рашэнне прадаўца. Па факце праверкі пасля высвятляецца, што прадавец і не ведаў пра існаванне пакупніка.

Па-другое, калі рыэлтарскія арганізацыі прапануюць пакупнікам маёмасць, якая змешчана ва ўласнай базе даных аб'ектаў нерухомасці або ў сеціве, яны тым самым прымаюць меры да выканання ўжо ўзятых на сябе абавязацельстваў па садзейнічанні продажу гэтых аб'ектаў.

— Работнікі рыэлтарскіх арганізацый абавязаны памятаць, што пры наяўнасці дагавора на аказанне паслуг прадаўцу па садзейнічанні ў продажы, яны прымаюць на сябе і адказнасць за здзелку куплі-продажу, якая ажыццяўляецца. На гэта мае права прадавец, калі заказвае ў агенцтве паслугі па продажы. Ніякія тлумачэнні пра тое, што аб'ект не будзе прададзены ці не будзе правярацца, калі дагавор на аказанне паслуг не заключыць і пакупнік, неправамерныя, — нагадала Дзіяна Падлеская.

Па-трэцяе, згодна з Грамадзянскім кодэксам, грамадзяне і юрыдычныя асобы вольныя ў заключэнні дагавора і прымус да гэтага недапушчальны. Такім чынам спажывец самастойна вырашае пытанне аб неабходнасці заключэння дагавора з рыэлтарскай арганізацыяй. А яна ў сваю чаргу можа патрабаваць аплату толькі на падставе заключанага дагавора.

Па-чацвёртае, спажыўцам рэкамендуецца ўважліва азнаёміцца са зместам дагавора на аказанне паслуг прадаўцу па аказанне паслуг рыэлтарскіх паслуг, а таксама тарыфамі на іх.

У адпаведнасці з ч. 2 п. 27 Правілаў дагавор на аказанне паслуг па садзейнічанні падчас заключэння, выканання, спынення дагавораў куплі-продажу аб'ектаў нерухомасці павінен утрымліваць умову аплаты паслуг у працэнтных адносінах ад кошту аб'екта з уключэннем у такую аплату затрат па рыэлтарскіх паслугах, якія ўказаны ў абзацах 2-6 пп. 1.3 п. 1 Указа Прэзідэнта № 15. Аплачваюцца гэтыя паслугі прадаўцом маёмасці ў адпаведнасці з дагаворам на аказанне рыэлтарскіх паслуг.

Міністэрства юстыцыі заклікае спажыўцоў уважліва ставіцца да заключэння дагавораў на аказанне рыэлтарскіх паслуг, а ў выпадку няўпэўненасці — звяртацца да кіраўнікоў рыэлтарскіх арганізацый або на «гарачую лінію».

Ірына СІДАРОК.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Андрэй КУЛЕШ — навуковы супрацоўнік Слуцкага краязнаўчага музея. У рэспубліканскім друку ў якасці празаіка выступае не так даўно і пакуль не вельмі актыўна, затое на сваім рахунку мае ўжо некалькі перамог у літаратурных конкурсах, бадай, самы гучны з якіх — конкурс маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы» (2018). Ну а самай нядаўняй яго творчай перамогай можна назваць выхад у фінал конкурсу «Слаўная кампанія: рэANIMАцыя», што праводзіць часопіс «Маладосць».

Думаю, чытаючы апавяданне «Дзірка», многія адразу звернуць увагу на мову маладога празаіка: бясспрэчна, праз яе мы чуем голас новага пакалення літаратараў, голас новай эпохі. І якой быць ёй, у многім залежыць ад маладых.

Алесь БАДАК.

Андрэй КУЛЕШ

Дзірка

Канец семестра — гэта нервова. Асабліва калі справа датычыцца інжынернай графікі. На здачу работ у канцы снежня чарга расцягваецца на дзясяткі метраў. Па меры ўсмоктвання даўжнікоў у семестравую яму ў мікраклімат будняў тутэйшых карпусоў уваходзяць пахмурны адчай і раздражненне. Часам справа пахне бойкай.

Стаіш пануры ад дэдлайнаў, стомлены, і нічога цябе не цешыць.

— Зноў сцены падпіраеце! — крычыць прыбіральшчыца.

— Не-а, не тыя сілы, каб падпіраць. Прыляпіўся.

Дадому хачу, сур'ёзна. Вясна, цёпла і размашыстыя краны ў рачным порце. Сесці на вастраве каля рыбакоў і глядзець, як сталёвыя жырафы грузяць баржу пяском. Палічыць свечкі вокнаў у цеплаходзе, калі яшчэ недастаткова цёмна для зорак. А потым замігціць світанак — і дойдзем кожны да свайго «інтэрната», і праспім першыя пары.

Так ці інакш, работы трэба здаць. Як — справа апошняя, галоўнае — запаветныя роспісы.

Гэта разумеў і Генадзь Веньямінавіч, той чалавек, дзякуючы якому ўсе сёння сабраліся.

Гумарыст ён і вельмі душэўны чалавек, але надта ж патрабавальны. Чаго вартае адно яго фірмовае: «Такая назва мудрагелістая, пішыце яе на слых, бо я гарнітурчык не хачу пэцкаць».

— Ууу, колькі гультаёў сабралася! — сеў ён за стол і пачаў шнарыць па кішэнях у пошуках акуляраў. — Хочаце сёння здаць і паехаць дадому пернікі есці? Ну дык вось што, людцы! Бачыце, у мяне за спінай ля дошкі цвічок убіты?! — і ўказаў, не паварочваючыся, далонню на цвік. — Хто павесіць свае ўжо гатовыя чарцяжы на ентат сімпатычны і блішчасты без усялякіх файлаў і тэчак, той малайчына! Калі пытанняў няма, я пайду, завару сабе гарбаты і хуценька вярнуся.

Ён устаў і імгненна рэцірававаўся ў сваю, як ён сам казаў, каморку.

Там вы не сустрэнеце знарочыстага кабінетна-лабараторнага глянцу. Гэта сапраўдная працоўная каморка, як у чалядніка. Са сваімі асаблівасцямі, зразумела.

Аднойчы ў кастрычніку мы з прыяцелем аднеслі туды натурныя ўзоры. На падлозе, проста на стыку двух палос лінолеуму, ляжалі нажніцы.

— Я падыму, — сказаў Паша.

Але Генадзь Веньямінавіч замахаў рукамі:

— Эээ, пакіньце там, дзе ўзялі.

— Добра.

Гаспадар глыбока зацягнуўся цыгарэтай і, зграбаючы левай рукой мадэлі фігур, сказаў:

— Не проста ж так ляжаць яны тут... А ведаеце, навошта?

— Не, а навошта?

— Эээ, тут у мяне ўсё не проста так. А нажніцы ляжаць пасярод кабінета для таго, каб я не забыўся пра свой тэлефон за зарадцы! Бо калі буду сыходзіць, абавязкова спатыкнуся аб іх і ўспомню. Стары ўжо! Ідзіце, я хачу спакойна дакурыць!

Ды куры ты ўжо, здавалася б, я ж не ханжа.

Пайду ў сталоўку — заесці катлетай крыўду. Баршчу ў сталоўцы можа і не быць, але пах капусты там прапісаны навечна. Стаў ворагам у чарзе, калі захацеў «першага» без смятаны: абураныя погляды і міны з відавочным «фі» — пацешна.

— Аэрадром вольны? — так гарэзны Веньямінавіч удакладняў, ці можна падсесці.

— Так-так, вядома. Прыемнага вам.

— Мм, дзякуй-дзякуй.

Мабыць, ён ужо ўзяўся за справу. Я ж у тэлефон утаропіўся — не люблю, калі ў гэтым працэсе на цябе глядзяць, у сваю чаргу, спрабую і сам не бянтэжыць. Шорхнуўшы па абрусе падносам, ён нечакана неяк звярнуўся, напэўна, гэта і называецца акадэмічнай роўнасцю:

— А я бачу, вам спадабаўся гэты «сметнік» старога Плюшкіна.

— Што? Лабаранцкая?

— Каморка!

— Вядома. Столькі ўсяго ўсякага. Макеты, фігуры, інструмент, партрэт легендарнага нашага галоўнага інжынера.

— Ммм, а некаторыя думаюць, што гэта Чэхаў. Цікавіцеся Ш.? — роўнае з паніжэннем тэмбру пытанне было падобнае на пароль, на манер як у падпольшчыкаў.

— Так. Інтэрнат насупраць узведзенага ім дома. Фатаграфіі старыя бачыў.

— Да капіталкі?

— Менавіта. Калі быў ужо струхлелы, але затое ўсё на месцы.

Ш. — легендарны архітэктар. Ён пачаў пры старых парадках, пазней працаваў пры новым рэжыме. Гімназія, дом культуры, пажарная часць з вышкай, мноства жылых дамоў і іншага. У гады ўваходжання новых пакаленняў у даросłае жыццё прынесены ў ахвяру на алтар «новага свету» — згніў за калючкай на балотах. Новы свет надышоў, ды не той. І ўладары гэтага свету яго ніяк не прызнаюць.

— Хадзем. Хочаш убачыць нешта цікавае?

Я не азваўся, ужо ішоў за ім, азіраючыся па баках і не верачы сваёй удачы. Ён адчыніў уваход на гарышча.

— Заходзь.

Лёгка, так, як дадому, упусціў. Цёмнае, астылае, пакінутае старое гарышча. Глыбокае, пыльнае, нават для галубоў няўтульнае. Ідэальнае месца, каб згубіць што-небудзь ці знікнуць самому. Верагодна, ён так і рабіў — «згубіў» нешта ад злосных-зайздросных вачэй.

Фота Анатоля КІПЕЧУКА.

— Вы там, малады чалавек, прыгінайцеся. Прыйшлі, аглядай.

Ёсць на што глянуць — столькі ўсяго. Шарэнгі ссунутых парт, іншыя з іх стаяць на фанерках і складзеных у шэсць столак сшыткавых лістах — барацьба за роўную паверхню. На канструкцыі, якая нагадвае рымскую чарапаху, раскінуўся макет горада, як наша планета на спінах земнаводных, толькі сівая легенда тут перайначана: зямная цвердзь ляжала на трох сланах, а тыя, у сваю чаргу, прытанцоўвалі тысячагоддзямі на горбе няшчаснай. Тут жа — проста чарапаха. Зрэшты, і такі варыянт легенды ёсць — без сланоў.

Як я зразумеў, гэта быў наш горад — гістарычны цэнтр. Здаецца, маштаб 1:400 або 1:600 — недзе каля таго. Нешта ў ім не так, падвох нейкі ёсць. Цэнтральныя вуліцы на месцы, з трасіроўкай усё акей. Будынак, яшчэ будынак... Ну зразумела! У макет па стане на 2013 год уключаны страчаныя архітэктурныя помнікі. Ідзём ад нашай шарагі і глядзім. Узарваны сабор на скрыжаванні вуліц. Гэтым выбухам «прабілі» сквер, «вызваліўшы» месца пад каток. Россып мадэрновых цагляных двухпавярховікаў. Чуў, што яны былі, але каб столькі! У васьмідзясятыя перашкодзілі новаму гаркаму. Самае брыдкае, што большая частка іх была не ў плошчы гэтага «саркафага». На іх месцы трава пучкамі ды кусты маркотнымі вожыкамі чахнуць. Гандлёвыя рады, дзівосна выкладзеныя цэглай і філігранна выразаныя з дрэва, загінулі ў 1943 годзе. Касцёл пачалі расцягваць на матэрыялы з саракавога года, а люфтвафэ давяршыла ў 41-м. Ходзяць легенды, што фугасы з тых самалётаў залятелі ў дамы тых, хто пабудаваўся на пыле касцёла. Не ведаю...

На сталах воддаль стаяць усе аб'екты, але ў маштабе 1:100, і шмат іншых страчаных.

— І як?

— Гэта цудоўна.

— Вельмі добра. Іншыя не ўбачылі б.

— Чаму гэта? — што, думаю, такія дурні тут вучацца, што не ведаюць?

— Ведаеш... Ім гэта тэма «не баліць». І таму, калі старонні сюды неяк трапіць, нічога ён тут не ўбачыць.

— Пацешна.

— Ходзь сюды.

Іду. Стаў ля нечага, прыкрытага мешкавінай.

— Сцягвай.

Опа! Вось гэта транклюкатар. Першая думка — як абазваць. На акуратна зваранай са зламаных крэслаў станіне — скрыня ад пажарнага крана, мабыць, усяго толькі корпус для «нутранкі». На ім збоку вушамі навісалі дзве электрычныя скрынкі — серабрыстыя, круглявыя, на выгляд цяжкія, з адтулінамі для ключа — і рубільнік. З чэрава ПК выглядваў на вынасе лазерны нівелір Bosch. Парабала — вялікая такая, некалькі баскетбалістаў за ёй схаваецца. Паверхня яе ўсеяная, як поле рэпай, шпулькамі — строга разлічанымі, на аднолькавай адлегласці.

— Што гэта?

— Я гэта называю «швейнай машынкай гісторыі» — дзіркі ў коўдры мінулага зашываць. Хочаш ведаць, як гэта ўсё працуе?

— Ага, але толькі як-небудзь для смяротных, а не з формуламі, графікамі і іншымі сістэмамі каардынат.

— Глядзі. Гэты лазер скануе патрэбны макет, які ставіцца на паднос. Потым лазер выстаўляецца на месца макета, дзе стаяў гэты аб'ект. А потым імпульс... Усё трэба рабіць пасля навальніцы. Дарэчы, для дакладнасці сігнал суправаджаецца антэнай з майго лецішча ў Зябраўцы — яна вісіць на каштане.

— І?

— Не ведаю дакладна. Павінен з'явіцца будынак, — з упэўненасцю выдатніка расказаў прынцып дзеяння і вынік.

— Так. А з чаго яно, так бы мовіць, генеруе пабудову?

— З такіх кампанентаў, як пыл гісторыі, попел падзей, вада стагоддзяў, калі і ад слёз радасці і смутку, пісьмовай гісторыі і чалавечай памяці, вось.

— Гэта ўсё ў нейкім мультысусвеце спачывае ці што?

— Менавіта.

Ці магло гэта быць сур'ёзным? І так, і не: ведаючы свайго настаўніка, можна было разлічваць на любы варыянт. Але хочацца дайсці да канца — да сутнасці.

— Трафімыч, — даверліва так, — а давай бахнем чаго, а? Шлёпнем дом 1906 года на незаконную паркоўку!

— Бахнем, абавязкова. Але рана — тут разетка ўсяго на 220. Ды і вылічыць могуць.

— Дакладна.

Смутак пабег па шыі да самых пят.

— Але ж я раз ужо бахаў. На гэта і 220 хапіла.

— Ды ну?!

— Памятаеш, гэтай вясной каля парку рабочыя наскочылі на пару старых падвалаў? А як сто трыццаць метраў брукаванкі выявілі, якую лічылі разабранай?

— Ого! — усё, што я змог. І на самай справе — хітра. Падвалы можна сапхнуць на бамбёжкі, а брук на хуткасную кладку асфальту ў цэнтры. Ні камар носа, ні дэтэктыў алоўка не падточаць...

Пасля ўсяго, што адкрылася, я праспяваў відавочнае і галоўнае пытанне. Думаю, ён сам яго чакаў і марыў хоць каму прэзентаваць сваю пазіцыю.

— Навошта вам гэта?

— Трэба і ўсё... Нейкае вострае пачуццё, ці што, адказнасці перад нашчадкамі, віны перад продкамі і сораму за сучаснікаў. Гэтыя ж вунь якія панэлі пляскаюць ды ўсё ў асфальт катаюць — ім толькі «мамона», прыбытак — гешэфт.

Бязладдзе адчуванняў. Быццам табе паказалі выключную рэч ці нейкі ўнікальны чужы талент. У цябе вочы гараць, табе хочацца, ты ўяўляеш, зайздросціш — і шалееш, калі не атрымліваеш. Але калі даведаешся, што за гэтым стаіць: праца, адказнасць, хваткa, стойкасць, пот, слёзы — многае адразу пераацэньваеш. Пацешна, мабыць, уяўляць сябе бажком, які можа многае павярнуць назад. Але ніхто не хоча, ды і не думае пра адказнасць, якая сціскае хамутом усяго цябе. Ці зразумеюць яго твор? Якая будзе рэакцыя? Каму можа перашкодзіць або перайсці дарогу? Ці трэба гэта каму?

А мы тым часам з настаўнікам спускаемся на павярхі ніжэй — нагамі і ў сваіх марах.

...Частка студэнтаў, якіх было крыху больш за дзясятак, адразу ж сарвалася з месцаў. Пакідаўшы тэчкі і файлы на падлогу, пачалі прабіваць свае чарцяжы цвіком. Складзеныя па ДАСТе былыя чарцяжы ператварaліся ў расхлябанае нішто, якое весела пагойдвалася на цвіку — стос папяровай масы для прыбіральні. З нервамі і мацюкамі ўсё было скончана на працягу некалькіх хвілін. Навааяўленыя «стаханаўцы» ўселіся з задаволеным выглядам бліжэй да цвіка і працоўнага месца выкладчыка.

У кабінет важна ўвайшоў Веніямінавіч з гарбатай. Сеў, паставіў кубак на аркуш і пасунуў крэсла бліжэй да стала. Убачыўшы задаволеныя твары тых, хто сядзіць побач, ён павярнуўся да цвіка са стосам чарцяжоў, хмыкнуў і, зноў павярнуўшыся, сказаў:

— Ну-с, давайце сюды свае... творы!

Знялі, паклалі.

— Ха! Ну я з вас, хлопцы, не магу! Ах, калі б вы былі на занятках, то ведалі б, што нічога старонняга на чарцяжах не дапускаецца.

Ён устаў з месца, узяўшы верхні чарцёж за край з відавочнай гідлівасцю:

— А тут во! Дзірка, паны і паненкі! Дзірка праз увесь чарцёж! Дзі-і-ірак быць не павінна!

Ён расцягваў словы так, быццам уяўным алоўкам прачэрчваў гэтую ісціну на паперы. На белай у свядомасці кожнага, і асабліва ў нашых «герояў».

— Вы не адужалі тэорыю, так што давядзецца перарабляць практыку. А калі яшчэ і чарцяжы пачытаць ды паглядзець, то там суцэльныя «містэйкі» будуць.

Яны зніклі практычна адразу, нібы правaліліся ад сораму скрозь міжпавярховыя перакрыцці. Ніхто не ведаў, чаго чакаць далей. Але Веніямінавіч усё разрадзіў:

— Гэта была задачка з зорачкай для абібокаў усялякіх. Хоць са студэнтаў-абібокаў часам атрымліваюцца вялікія людзі... А для руплівых хлопчыкаў і дзяўчынак у мяне аўтаматы! Давайце на чарзе з чарцяжамі і залікоўкамі! І не натоўпам.

Менавіта. «Дзірак» нідзе быць не павінна: ні ў дробязях матэрыяльных, ні ў высокай матэрыі і памяці — нідзе.

Каштоўнасці

КАМФОРТ НЕ ЎНУТРЫ СЯБЕ, А Ў НАВАКОЛЬНЫМ СВЕЦЕ

Чаму маладыя маці не спяшаюцца ўступаць у шлюб

У краіне наладжана выдатная сістэма сацыяльнай падтрымкі сем'яў, асабліва шматдзетных. Але ёсць пытанні ў плане псіхалагічнай і матэрыяльнай падтрымкі маладых сем'яў, падахвочванні маладых людзей да больш ранняга ўступлення ў шлюб і нараджэння дзяцей. Такім меркаваннем падзялілася кіраўнік Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» Вераніка СЯРДЗЮК.

Фота БелТА.

— Цяпер у грамадстве мяняюцца рэпрадуктыўныя ўстаноўкі: узрост уступлення ў першы шлюб павялічыўся ў жанчын да 26 гадоў, у мужчын — да 28 гадоў. Сярэдні ўзрост нараджэння першынца — 29 гадоў. Калі ў мінулыя гады ў нас нараджалася прыкладна 100 тысяч немаўлят, то летась — 87 тысяч. Каля 10 працэнтаў з іх — гэта дзеці, захаваныя ад абортаў, дзякуючы перадабортнаму кансультаванню. Акрамя таго, 60 працэнтаў усіх народжаных дзяцей — гэта другія, трэція і наступныя. Такія паказчыкі сведчаць аб тым, што маладыя людзі на сёння настроены больш на кар'еру, чым на стварэнне сям'і. Нават сярод школьнікаў 6—10 працэнтаў тых, хто ўвогуле не бачаць сэнсу ў рэалізацыі сябе як бацькоў у далейшым. Але дзяржава павінна быць зацікаўлена ў больш ранніх нараджэннях — гэта дае больш шанцаў на тое, што ў перспектыве ў сем'ях будзе больш за адно дзіця.

Вераніка Сярдзюк заўважыла, што на дзяржаўным узроўні ў краіне пакуль што няма курсаў падрыхтоўкі да сямейнага жыцця для моладзі (не для школьнікаў, а менавіта маладых пар). Але ёсць адзінкавыя ініцыятывы.

— Напрыклад, распрацавана праграма сем'яznаўства ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка. Упэўнена, што такія курсы трэба ўводзіць у ВНУ, а не ў школах, бо старшакласнікі звычайна не вельмі хочуць наведваць факультатывы пра сямейныя каштоўнасці, калі ім трэба рыхтавацца да паступлення ва ўніверсітэт. Таксама ў Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей вырашаюць цэлы комплекс праблем, аказваюць псіхалагічную падтрымку. Было б добра, калі б такі вопыт па выхадзе з крытычных сітуацый і дапамозе сем'ям, якія апынуліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, транслявaўся на ўсю краіну. Думаю, што неабходна і пераймаць вопыт іншых краін, але адаптуючы іх мадэлі пад традыцыі славянскага менталітэту.

Важныя пытанні ў сферы падтрымкі маладых сем'яў на сёння — гэта наяўнасць месцаў у сямейных інтэрнатах, фінансавая дапамога або магчымасць адправіць дзяцей, напрыклад, у дзіцячы сад пры ВНУ, лічыць спікер. «Дагэтуль няма нейкіх забаўляльна-педагагічных, асветніцкіх праграм на тэлебачанні, якія дапамагалі б спраўляцца з сямейнымі праблемамі. Хацелася б, каб яны з'явіліся ў нашай інтэрнэт-прасторы. Увогуле меркаванне амаль кожнага фарміруецца пад уздзеяннем СМІ, інтэрнэту і асяроддзя, аднагодкаў. Калі ў маладога чалавека ёсць вопыт клопату аб маленькім дзіцяці, напрыклад, пляменніку або пляменніцы, малодшым браце або сястры, гэта збольшага рыхтуе да будучага ўласнага бацькоўства, здымае страх», — упэўнена Вераніка Сярдзюк.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Спорт-тайм

Вяртанне тэніса і залаты дубль «Мінска»

Што новага ў спартыўным свеце

У традыцыйным штотыднёвым аглядзе «Звязды» прапануем вашай увазе свежыя спартыўныя навіны.

1. Аляксандра Сасновіч скончыла выступленне на тэнісным турніры ў Празе. Беларуская спартсменка ў матчы другога круга кваліфікацыі прайграла Алене-Габрыэле Русе з Румыніі.

На мінулым тыдні Аляксандра выступала і на турніры Palermo Ladies Open. Падчас спаборніцтваў Аляксандра перамагала саперніц, вышэйшых за яе па рэйтынгу. У рэйтынгу WTA яна займае 119-ю пазіцыю. У 1/16 фіналу беларуская тэнісістка ўпэўнена абыграла ў двух сэтах 23-ю ракетку свету бельгійку Элізэ Мертэнс — 6:4, 6:1. У матчы 1/8 фіналу Аляксандра ў двух сэтах перамагла прадстаўніцу Італіі Ясмін Пааліні, якая займае 95-е месца ў рэйтынгу WTA. Але ў 1/4 фіналу прайграла харвацкай саперніцы Петры Марцінч.

Турнір Palermo Ladies Open стаў першым афіцыйным стартам пасля перапынку, звязанага з пандэміяй COVID-19. Наступным вялікім міжнародным турнірам для Аляксандры Сасновіч стане US Open. На гэтых спаборніцтвах у парным разрадзе выступіць яшчэ адна беларуская тэнісістка Лідзія Марозава.

2. 8-9 жніўня прайшоў III этап галоўнага айчыннага турніру па баскетболе 3х3 «Palova». За тытул чэмпіёна змагаліся 138 калектываў. Гэтым разам турнір праходзіў у шасці катэгорыях: «Эліта», «Агульная», «Дзяўчаты 17», «U-14», «U-12».

У спаборніцтвах самай прэстыжнай катэгорыі «Эліта», якія прайшлі 9 жніўня, узялі ўдзел восем камандаў. Перамагла каманда «U-23», у складзе якой выступаюць кандыдаты ў мужчынскую зборную Беларусі 3х3 да 23 гадоў Максім Лютыч, Цімафей Паралёў, Валянцін Назараў і Максім Каратцоў.

IV этап турніру адбудзецца 22—23 жніўня 2020 года. У фінале найлепшыя каманды сустрэнуцца 5 верасня.

3. Беларускія шашысткі перамаглі Латвію ў 1/4 фіналу Кубка нацый. Спаборніцтвы, арганізаваныя Сусветнай федэрацыяй шашак, праходзяць па 100-клетачных шашках. Першая гульня скончылася ўнічыю. У гульні ў адказ нашы шашысткі абыгралі сваіх апанентаў з вынікам 5:3. У паўфінале беларускі сустрэнуцца з камандай Украіны. У жаночых спаборніцтвах удзельнічалі 11 камандаў, шэсць найлепшых выйшлі ў плэй-оф.

У першым туры беларускі перамаглі каманду Нідэрландаў. Другі раўнд прапусцілі праз няцотную колькасць удзельнікаў, трэці раўнд з камандай Украіны скончыўся ўнічыю. У чацвёртым туры беларускі перамаглі саперніц з Латвіі. У пятым прайгралі камандзе Расіі. Але ў шостым абыгралі прадстаўніц Ізраіля і потым прайгралі апанентам з Манголіі. У восьмым і дзявятым раўндзе беларускі перамаглі каманды Кітая і Сурынама адпаведна. Паспяхова склаліся 10-ы і 11-ы раўнды, беларускі абыгралі Эстонію і Бразілію.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

4. Скончыўся Кубак Беларусі па хакеі на траве сярод жаночых камандаў. Пераможцамі спаборніцтваў сталі спартсменкі хакейнага клуба «Мінск». На другім месцы — гродзенскі клуб «Рытм», на трэцім — «Тэкстыльшчык БарДУ» з Баранавіч. Клуб «Мінск» заваяваў залата чэмпіянату Беларусі сярод мужчынскіх камандаў. Сталічная каманда перамагла брэсцкі «Будаўнік» з вынікам 5:0. Трэцяе месца заняў клуб «Гомель».

5. Хакей вернецца на «Мінск-арэну» ўжо ў верасні. 3 верасня «Дынама-Мінск» сыграе першы матч новага сезона. «Зубры» сустрэнуцца з фінскім «Ёкерытам» на «Мінск-Арэне». Матч на беларускім лёдзе пройдзе ў рамках адной з сямі сустрэч. Ён адбудзецца на наступны дзень пасля розыгрышу Кубка адкрыцця. За гэты трафей будуць змагацца 2 верасня маскоўскі ЦСКА і казанскі «АК Барс».

Валерый СЦЯЦКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
ОАО «Агро-сад Рассвет»

Предмет торгов: лот – капитальное строение с инвентарным номером 100/С-55337 (наименование: здание; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 623,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Чернавчицкий с/с, 31, 0,1 км, западнее д. Несвило, здание, на земельном участке с кадастровым номером 121284600001000048, площадью 0,3644 га

Начальная цена, руб. (без НДС)	**11 468,80**	**Размер задатка, руб.**	**1 146,88**
Продавец	ОАО «Агро-сад Рассвет», Брестская обл., аг. Вистычи, ул. Центральная, 22, УНП 200035041		
Организатор аукциона	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»		
Р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245		
Условия продажи	Без условий		
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона		
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи		
Информация о возмещении затрат	Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона		

Аукцион состоится 02 сентября 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию, можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162)-20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 01 сентября 2020 г. до 17.00

Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Агро-сад Рассвет» размещено в газете «Звязда» от 18.02.2020

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Логойского филиала Минского облпотребобщества (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ МАГАЗИНА № 89

(составные части и принадлежности: сарай, крыльцо)
с инв. № 601/С-13147общей площадью 204,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623284605301000031 (право постоянного пользования) площадью 0,1063 га по адресу: Минская область, Логойский район, Логойский с/с, д. Слаговище.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 35 742,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **3 574,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **http://www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2020.

Аукцион состоится **24.08.2020 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.08.2020 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Трест Белтрансстрой»** (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8, тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТКОНСАЛТ».

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **26 августа 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. без НДС
1	Морской контейнер, 6*2,45, инв. № 177	2 233,00
2	Бытовка «Штаб», 6*4,8, инв. № 7249	6 511,62
3	Бытовка «Прорабская», 6*4,8, инв. № 696	5 283,01
4	Бытовка, 6*2,45, инв. № 7276	4 361,56
5	Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.41	4 361,56
6	Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.36	4 361,56
7	Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.30	5 405,88
8	Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.39	4 361,56
9	Станок для резки арматуры, инв. № 110.94	2 911,80
10	Станок для гибки арматуры, инв. № 110.90	3 593,68

Местонахождение предметов торгов: РФ, Калужская обл., г. Балабаново, ул. Гагарина, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 12.08.2020 г. с 09.00 по 25.08.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о раннее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 04.06.2020 г.

ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

Фота Анатоля КІШЧУКА.

Извещение о проведении 26 августа 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)*					
№	Наименование	Инв. номер	Местонахождение	Начальная цена в бел. руб. без НДС	Размер задатка в бел. руб.
1	Печь мод. ДСПТ-12И1, год выпуска – 1991	4234350	г. Минск, ул. Социалистическая, 2	741 500,00	74 100,00
2	Печь мод. ДСПТ-12И1, год выпуска – 1991	4234351		741 500,00	74 100,00
3	Печь мод. ИЧКМ-16/08И-1, год выпуска – 1991	4234352		349 500,00	34 900,00
4	Печь мод. ИЧКМ-16/08И-1, год выпуска – 1991	4234353		349 500,00	34 900,00

** Комплектация продаваемого имущества определена в соответствии с приказом генерального директора ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ» от 17.01.2020 № 18 «О реализации электропечей ДСПТ-12И1 и ИЧКМ-16/08И1».*

Продавец имущества: ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **26 августа 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 11.08.2020 по 24.08.2020 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Багута, дер. Прилепская Усяжка, ул. Подгорная, дер. Малое Залужье, участок № 15, дер. Вишня, Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА: ОЗЕРИЦКО-СЛОБОДСКОЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	дер. Багута	624883000601000112	0,0827	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	30000
2	дер. Прилепская Усяжка	624883008201000113	0,0921	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	12000
3	дер. Малое Залужье, участок № 15	624883006601000148	0,1436	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	10000
4	дер. Вишня	624883001801000041	0,1373	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома))	10000

